незалежная газета

№ 3 (601) 21 студзеня 2009

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады.



## Свой катэдж міністр Навумаў ужо дабудаваў

Старонка 6



## Яны забівалі Кені

Старонка 13

## Паліцаі пакараны. А партызаны?

Старонка 12

### У НУМАРЫ

**Бурак Абамчык**

Прэзідэнцкія выбары-2011 — амерыканскі варыянт для Беларусі? **Старонка 3.**

**Беларуская АЭС — блеф?**

Гэтага варыянту не выключае прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубіліос. **Старонка 4.**

**Гуляка, выходзь да палякаў**

Палякі Гродна праявілі салідарнасць са сваёй апальнай лідэркай. **Старонка 9.**

**КДБ вербуе праз vkontakte.ru**

але з палітычных матываў. Некалькі студэнтаў у розных гарадах разгаласілі факт шантажу. **Старонка 9.**

**Кагнітыўны дысананс**

Аляксандр Зімоўскі пра ідэалагічны паварот уладаў: катэгарычная адсутнасць крызісу ў Беларусі змяніла суверэнную дзяржаву ў цэнтры Еўропы трохі больш чым поўнасцю. **Старонка 7.**

**Кроў і газ**

Цягам апошніх тыдняў тэлегледачам прапанавалася два галоўныя шоу: сектар Газа і газавая вайна між Расіяй і Украінай. Піша Віталь Тарас. **Старонка 7.**

**У ЛПП — з аркестрам**

Фотарэпартаж Юліі Дарашкевіч. **Старонка 11.**

**Замест аграгарадкоў — кібуцы**

Пошта Рэдакцыі. **Старонка 10.**

## У Гродне адбудуюць каралеўскі замак

Старонка 8.



# Балта-Чарнаморская вось

Жыццё прымусіла рэалізоўваць гэтую ідэю тых, хто яе тармазіў.



PRESIDENT.GOV.UA

У дзень інаўгурацыі Абамы і аднаўлення паставак расійскага газу ў Еўропу ў Чарнігаве сустрэліся кіраўнікі Беларусі і Украіны Аляксандр Лукашэнка і Віктар Юшчанка. Гэта быў выразны палітычны сігнал Захаду і Ўсходу. Сігнал падвойны: ні адзін, ні другі не прынялі запрашэння Мядзведзева і не паехалі ў Маскву на газавы саміт у мінулую суботу.

Беларуска-ўкраінская сустрэча ў вярхах доўгі час адкладалася, каб нарэшце адбыцца ў момант найбольшага абвастрэння расійска-ўкраінскіх і найбольшага пацяплення беларуска-еўрапейскіх адносінаў.

На пачатку чарнігаўскай сустрэчы Лукашэнка ў прысутнасці журналістаў нагадаў аб прапанове прэзыдэнта Ўкраіны стварыць калідор Чорнае мора — Балтыйскае мора. «Мы гатовыя працаваць з вамі і з краінамі Балтыі ў гэтым кірунку», — сказаў ён.

Ідэі, вылучаныя яшчэ на пачатку XX стагоддзя беларускім палітыкам Антонам Луцкевічам і адроджаныя ў 1990-х, грунтуюцца на разуменні супольных інтарэсаў дзяржаваў, размешчаных між Чорным і Балтыйскім морамі. За гэты час змянілася структура эканомікі, але не геапалітычная рэальнасць. На ўсходзе — Расія са сваімі інтарэсамі, а энергетычную бяспеку можна гарантаваць толькі ўраўнаважваннем патокаў усход-захад новымі — з поўдня на поўнач.

Беларусь — звяно ва ўсходнееўрапейскім ланцугу, без якога Балта-Чарнаморская вось не будзе поўнай.

Якія канкрэтныя формы можа мець супраца Ўкраіны і Беларусі сёння?

Па словах Юшчанкі, у Чарнігаве была дасягнутая дамоўленасць аб аднаўленні экспарту ўкраінскай электраэнергіі ў Беларусь і праз нашу краіну ў Балтыю, дзе пасля закрыцця Ігналінскае АЭС будзе дэфіцыт электрычнасці. Рэалізацыю гэтага праекту 15 студзеня ў Гомелі абмяркоўвалі віцэ-прэм'еры беларускага і ўкраінскага ўрадаў Уладзімір Сямашка і Аляксандр Турчынаў. Яны суправаджалі прэзідэнтаў і ў Чарнігаве ў якасці кіраўнікоў супольнай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічнай супрацы.

Юшчанка і Лукашэнка дамовіліся аб арганізацыі трохбаковае сустрэчы міністраў замежных справаў Літвы, Беларусі і Ўкраіны ў Літве, каб падрыхтаваць адпаведныя праекты рашэнняў.

Бакі абмеркавалі таксама іншыя ініцыятывы, цікавыя для дзвюх краінаў, а таксама Польшчы і Балтыі, у тым ліку транспартны калідор «Вікінг», які мае злучыць рэгіён ад Скандынавіі да Турцыі.

Наступны пункт супадзення інтарэсаў — газавая сфера. У мінулыя гады «Газпрому» ўдавалася цаной зніжак эфектыўна блакаваць каардынацыю дзеянняў Украіны і Беларусі. Гаворачы пра канфлікт гэтага году, Юшчанка падкрэсліў, што «ўжо ніколі не будзе газавая палітыка такой, якой яна была да 1 студзеня 2009 году. Выйдуць усе з навукай: Украіна, Беларусь, Расія, Еўрапейскі Саюз. Мы больш такімі не будзем: бесклапотнымі, даверлівымі».

З часам Украіна і Беларусь маглі б выбудаваць супольны маршрут для транзіту нафты й газу з зоны Каспію. Лукашэнка падкрэсліў, што праект нафтаправоду «Адэса-Броды» не страціў сваёй актуальнасці для Беларусі. «Мы можам забяспечваць праз нашу транспартную сістэму нафтай дзяржавы Балтыі, Польшчу», — сказаў А.Лукашэнка. Ён лічыць, што ў выпадку рэалізацыі праекту будзе выгадна перапрацоўваць каспійскую нафту на беларускіх НПЗ.

**Працяг на старонцы 3.**

ЗАМЕСТ КАМЕНТАРУ

# Служыць бы радыя...

У боты хочуць абуць двух юнакоў, вядомых лідэраў апазіцыі — Івана Шылу і Франака Вячорку.

І аднаго, і другога летась выключылі за палітычную дзейнасць з навучальных установаў. Франака — з журфаку БДУ, Івану ж нават не далі атрымаць атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы.

Амаль адразу ў хлопцаў узніклі праблемы з ваенкаматамі. Што праўда, Вячорка з Шылам абралі розныя тактыкі.

Першы трубіў аб сваім прызыве ва ўсіх СМІ, у ваенкамат яго дастаўлялі альбо міліцыянты, альбо супрацоўнікі спецслужбаў, некалькі разоў Франак ляжаў на абследаваннях у шпіталях. У хлопца была адтэрміноўка да сакавіка пасля аперацыі на воку, але адразу пасля Новага году пра яго ўзгадалі зноў. Наступная павестка Франаку выпісаная на 26 студзеня.

Шыла ж не рабіў з свайго прызыву медыйнай падзеі. Ціха прайшоў медкамісію, якая прызнала яго годным. Тым не менш, лекараў у ваенкамаце кантраляваў мясцовы чэкіст, які курыруе апазіцыю.

Франак настойвае на тым, што ў яго ёсць праблемы са здароўем, несумяшчальныя са службай у войску. «Гатовы прайсці незалежную медычную экспертызу і адправіцца ў войска, калі буду прызнаны прыдатным. Гэта камісія мусіць быць сфармавана з спецыялістаў, на якіх не будзе ажыццяўляцца ціску ані з боку Міністэрства абароны, ані з боку спецслужбаў», — кажа лідэр «Маладзі БНФ».

БТ тым часам задаецца пытаннем, чаму ў войску служаць сапраўдныя прынцы (англійскі Гары), але не хочуць «прынцы беларускай апазіцыі». У працівагу ў «Панараме тыдня» быў паказаны рэпартаж з вайсковых часцей раней мабілізаваных апазіцыянераў Віталя Каратыша і Алеся Каліты. Начальнікі характарызавалі байцоў як адных з найлепшых.

Удзел гэбістаў у медкамісіях і рэпартажы БТ наводзяць на думку, што гэта адна вялікая прапагандысцкая кампанія.

І Шыла, і Вячорка не супраць пайсці ў войска. Адзінае, што яны патрабуюць ад ваенкамаўскіх работнікаў, — роўных умоваў з астатнімі прызыўнікамі. Яны, дарэчы, самі разумеюць, што для палітычнай кар'еры служба ў арміі лішняй не будзе.

**Зміцер Панкавец**

# Бурбалкі

У інтэрнэце сцвярджаюць, што Ялфімава выбралі пераможцам сёлетняга адбору на «Еўрабачанне» задоўга да фінальнага канцэрту. Праверыць праўдзівасць вынікаў «галасавання гледачоў» у Беларусі няма тэхнічных магчымасцей. Дыплом жа Ялфімава як пераможцы адбору на «Еўрабачанне» быў апублікаваны ў інтэрнэце задоўга да сканчэння «галасавання».

Эксперты наракаюць, што сапраўдны выбар робяць тэлепрадзюсэры, а астатнія канкурсанты з сваімі слабымі ці кепска запісанымі песнямі — толькі масоўка для інтрыгі.

«Еўрабачанне» ў большасці краін Еўропы глядзіць добра калі пара працэнтаў тэлегледачоў. А ў Беларусі гэта проста такі справа ўсенародная. Што зробіш, калі пісьменніка Арлова ці гісторыка Грыцкевіча па ТВ за 15 гадоў не паказвалі ні разу, а роля папсы ў жыцці народу ўзнесеная да нябёсаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

КВІТАНЦЫЯ

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы заўжды традыцыйна дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічаюць грошы на выхад газеты.

### Дзякуй

**Паўлу С.** з Горацкага раёну.
**Дзмітрыю Ч.** з Капыльскага раёну.
**І.Дз., Наталлі М., Г., Ігару Л.** з Стаўбцоўскага раёну.
**В.Б.** з Шчучынскага раёну.
**Уладзіміру В.** з Кобрынскага раёну.
**Аляксандру М.** з Астравецкага раёну.
**С.Ж.** з Клецкага раёну.
**Сцяпану А.** з Асіповіцкага раёну.
**Д.К.** з Мастоўскага раёну.
**Івану К.** з Бярозаўскага раёну.
**Алесю С.** з Карэліцкага раёну.
**А.Ш.** з Ваўкавыскага раёну.
**П., Г.С., Алe Г.** з Бабруйскага раёну.
**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.
**Валянціне М.** з Навагрудскага раёну.

# Бурак Абамчык

## Прэзідэнцкія выбары–2011 — амерыканскі варыянт для Беларусі?



Яшчэ нядаўна чорныя не мелі права вучыцца ў адных школах з белымі.

Не паспелі яшчэ адцвісці джынсавыя стужкі-кветкі на дрэўцах ды слупах, як нашыя апазіцыйныя асяродкі, здаецца, ужо амаль зацяжарылі іншай ідэяй — спарадзіць беларускага Абаму. Не здзіўлюся, калі гэтымі доўгімі зімовымі вечарамі ў якім-небудзь партыйным офісе ўжо пішацца стратэгічны план на наступную прэзідэнцкую кампанію з прыцэлам на «энэргічнага палітыка новай генерацыі», а сам будучы кандыдат — назавем яго Бураком Абамчыкам — прымярае на сябе модны гальштук ды белазубую ўсмешку.

Жарты жартамі, але размовы пра беларускага Абаму нельга назваць цалкам наіўнымі ды беспадстаўнымі. У беларускай ды амерыканскай сітуацыях сапраўды можна адшукаць цікавыя паралелі. Чаму прыход Барака Абамы зрабіўся сенсацыяй? Найперш таму, што гэты палітык здолеў заваяваць давер большасці жыхароў сваёй краіны, нягледзячы на тое, што належыць да колісь дыскрымінаванай групы афраамерыканцаў. У сучаснай Беларусі прыход да ўлады беларускамоўнага чалавека і шчырая ўсенародная любоў да яго чым не магчымыя?

Пытанне расы ў ЗША не менш слізкае, чым пытанне мовы ды культурнай прыналежнасці ў Беларусі. Большасць амерыканцаў, у прынцыпе, падзяляе думку, што ўсе грамадзяне краіны, нягледзячы на іх колер скуры, роўныя ў сваіх правах. Падобным чынам і большасць беларусаў (прынамсі, такую выснову можна зрабіць з апошняга перапісу насельніцтва) прымае беларускую мову — тэарэтычна.

Іншая рэч, як белыя амерыканцы дачыняюцца з чарнаскурымі ў штодзённым жыцці, а паспалітыя беларусы — са сваімі беларускамоўнымі суайчыннікамі. І ў першым і ў другім выпадку стаўленне нярэдка такое самае, як да меншасці. Зірніце на амерыканскія даляры — ці шмат пабачыце на іх чарнаскурых прэзідэнтаў? Вось вам — краіна роўных магчымасцяў! Гэта, дарэчы, старая амерыканская дыскусія: чаму палітычная эліта ЗША дагэтуль, у сваёй масе, белая? Адны сцвярджаюць, што ніякая гэта не дыскрымінацыя — проста, маўляў, чарнаскурае насельніцтва надта пасіўнае, не ўмее і не жадае скарыстацца з шанцаў, якія дае ім дэмакратычнае грамадства. Іншыя ж, наадварот, кажуць пра тое, што афраамерыканцы ўжо ад нараджэння маюць горшыя стартавыя ўмовы, бо нараджаюцца ў бяднейшых раёнах, вучацца ў горшых школах, пакутуюць ад побытавага расізму і г.д.

А як у нас, у Беларусі? Вось, скажам, вы — беларускамоўны чалавек, які спрабуе зрабіць кар'еру на дзяржаўнай службе ці ў бізнесе. Далёка пойдзеце? І калі не выб'ецеся ў людзі, то хто будзе ў тым вінаваты — асяроддзе, варожае да вашай беларускамоўнасці, ці вы самі, няздольныя, насуперак цяжкасцям, дамагчыся поспеху? Куды падзяваліся беларускамоўныя на кіроўных пасадах? Зацерлі іх, не далі ходу? Ці яны, сутыкнуўшыся з цяжкасцямі, прыхавалі перакананні да лепшых часоў, наступілі на горла ўласнаму спеву дзеля кар'еры? Тут, дарэчы, мы выразна бачым розніцу паміж мовай ды расай — з беларускай на расійскую, польскую, ангійскую можна пераключыцца ў любы момант (ці, прынамсі, паравучыцца), а вось колер скуры ў кішэню не схаваеш (калі, канечне, вы не Майкл Джэксан). Можа, каб беларусам тая беларуская мова была на твары напісаная, дык і быў б яны тады больш прынцыповымі... А так заўжды ёсць спакуса падладзіцца, схавацца, замаскіравацца.

У Барака Абамы такога выбару не было — якім нарадзіўся, такім і ў палітыку пайшоў. Чарнаскурыя палітыкі, насамрэч, ужо неаднаразова рабілі спробы выбіцца ў прэзідэнты ЗША. Дзеля гэтага яны, па старой завядзёнцы, намагаліся мабілізаваць чорнае насельніцтва, скалаціць пярэстую кааліцыю з праваабаронччых рухаў, шукалі падтрымкі ў іншых дыскрымінаваных групах — карацей, усяляк спрабавалі ўзмацніць сілу сваёй меншасці. Абама таксама спачатку паддаўся гэтай спакусе. Нея на пачатку сваёй прэзідэнцкай кампаніі, вярнуўшыся ў ЗША пасля туру па Еўропе, ён пачаў быў акцэнтаваць увагу на колеры сваёй скуры: «Я не падобны да іншых прэзідэнтаў на нашых грашовых купюрах!». Вынік быў нечаканым — ад гэтага бяскрыўднага сказу рэйтынг палітыка пачаў падаць.

> **Размовы пра беларускага Абаму нельга назваць беспадстаўнымі.**

Тады Барак Абама абраў кардынальна іншы шлях — ён выкінуў з прамоваў любыя ўзгадкі пра «будучага першага чарнаскурага прэзідэнта». Замест гэтага ён прэзентаваў сябе выключна як «прэзідэнта, які прынясе змены». Калі вы прасочыце кампанію Абамы, то заўважыце, што ён не толькі не выкарыстоўваў свой колер скуры для стварэння іміджу, але ўвогуле ўсяляк намагаўся абыходзіць расавыя пытанні, канцэнтруючыся замест гэтага на праблемах, якія стаяць перад усёй Амерыкай. Больш за тое — чым больш актыўнай рабілася кампанія, тым старанней кандыдат імкнуўся пазбягаць таго, каб яго наўпрост звязвалі з негрыцянскім рухам, многія з дзеячаў якога, заслужана ці не, для многіх амерыканцаў выглядаюць радыкаламі.

Уявіце сабе, што беларускамоўны палітык, набраўшы папулярнасць, раптоўна пачынае пазбягаць кантактаў з апазіцыйнымі партыямі ды рухамі, абыходзіць у прамовах «моўныя» пытанні, а ў інтэрв'ю «Першаму музычнаму» раіць маладым апазіцыянерам узяцца за розум (запрошаны на тэлеканал MTV, Абама параіў афраамерыканскай моладзі кінуць моду насіць прыспушчаныя порткі). «Зазнаўся! Прадаўся! Здраднік!» — пачуе ён у свой бок. Нядзіўна, што многія дзеячы амерыканскага чорнага руху дужа пакрыўдавалі на Абаму.

Парадаксальна, але на пачатку перадвыбарчай кампаніі апытанні паказвалі, што чорнае насельніцтва не так ужо і верыла ў поспех Абамы. «Ніхто яго не пусціць да ўлады, а калі і пусціць, то адразу заб'юць», — такая была логіка. А яшчэ многія меркавалі так: «Хай Хілары Клінтан белая, але яна, прынамсі, мае болей шанцаў на перамогу, дык прагаласую за яе — абы толькі дэмакраты перамаглі». Падобным чынам той-іншы з нас пачынае губляць веру ў хоць нейкую імавернасць таго, што беларускамоўны палітык калі-небудзь атрымае поспех.

Але, калі шанцы Абамы на перамогу зрабіліся сапраўды рэальнымі, то нават самыя пакрыўджаныя суцішыліся — надта высокія былі стаўкі. Першы чорны прэзідэнт ЗША — гэта вам не жарты! А тое, што ён афраамерыканец — дык гэта бачна і без залішніх словаў.

У выніку пытанне расы Абамы знікла як тэма, адышло на другі план. А на першы план выйшаў змест ідэяў маладога палітыка. Хілары Клінтан зрабіла стаўку на «досвед», а Барак Абама на «змены» — і гэтае кароткае слова зрабілася ключом да яго перамогі. Рэспубліканцы абрыдлі амерыканцам сваімі войнамі ды барацьбой з тэрорам. Людзям захацелася зменаў.

Напярэдадні мінулых парламенцкіх выбараў у верасні 2008 г. НІСЭПД правёў апытанне, з якога вынікала, што большасць (61,8%) беларусаў не верыць, што ў краіне нешта зменіцца, і ў той жа час 52,2% жадаюць, каб гэтыя змены адбыліся. «Змены, у якія мы можам паверыць», — такім быў дэвіз Барака Абамы. Акурат для нас.

Атрымліваецца, справа зусім не ў колеры гальштука, які пачэпіць сабе на шыю Бурак Абамчык. І, нават карыстаючыся расійскай моваю, ён не гарантуе сабе перамогі, а выбраўшы беларускую, не асудзіць сябе на параз (як, зрэшты, і наадварот). Галоўнае — натхніць беларусаў на веру ў змены. Ну і каб сам быў здольны. Як Абама.

**Алесь Кудрыцкі**

# Балта-Чарнаморская вось

Працяг са старонкі 1.

Дзве краіны ўзаемадапаўняльныя і ў некаторых іншых сферах.

Лідэры Беларусі і Украіны маюць розны палітычны радавод. Адзін стварыў аўтакратыю і выказваў намер кіраваць ёю неабмежаваны час. Другі прыйшоў да ўлады ў выніку мірнае рэвалюцыі і, мяркуючы па ўсім, пасля сканчэння першага ж тэрміну паўнамоцтваў, наступнай зімой, пакіне сваю пасаду.

На твары аднаго засталіся шнары ад атручвання дыяксінам, які выраблялі ў расійскіх лабараторыях. Другі 15 гадоў кіраваў, задобрываючы насельніцтва за кошт расійскіх датацый. Аднак злабаджонныя эканамічныя патрэбы прымушаюць іх дамаўляцца.

«Мы чакаем вас у Мінску ў любы час з працоўным ці афіцыйным візітам. Нашы людзі таксама з цікавасцю чакаюць вашага прыезду», — цытуюць Лукашэнку журналісты.

На шляху стратэгічнага супрацоўніцтва ў Міжмор'і стаіць яшчэ істотная перашкода — розніца палітычных сістэмаў. Усе краіны Балта-Чарнаморскае зоны — дэмакратычныя, акрамя Беларусі. Лукашэнку ўжо 10 гадоў не запрашалі на міжнародныя сустрэчы кіраўнікоў краінаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Прыклад Еўрасаюзу паказвае, што эфектыўна супрацоўнічаць могуць толькі краіны аднаго ладу, паяднаныя блізкасцю палітычных культураў. Таму амаль чатырохгадзінная гаворка ў Чарнігаве не магла не выходзіць за рамкі эканомікі. Хоць перамовы адбываліся ў фармаце сам-насам і пра іх дэталі нічога не вядома, пасля сустрэчы Лукашэнка выказаў удзячнасць Ючанку за «каласальную пастаянную падтрымку» на ўсіх узроўнях камунікацыі з еўрапейскімі ды амерыканскімі партнёрамі, дзякуючы чаму ўдалося «наладзіць дыялог між Беларуссю і Захадам».

**Мікола Бугай**

# Расія, Украіна пераходзяць на рынкавыя цэны за газ

На даволі выгадных для Украіны ўмовах.

Стаяла ўжо глыбокая ноч, калі прэм'ер-міністры Расіі і Украіны абвесцілі пра выпрацоўку пагаднення, якое ўрэгулюе газавы канфлікт, у выніку якога паў-Еўропы засталося без паліва.

Уладзімір Пуцін заявіў, што Украіна ў наступным годзе будзе плаціць за газ еўрапейскую цану, мінус 20%-я скідка. Гэта азначае істотны рост цэнаў для Украіны ў першым квартале гэтага году, але значнае падзенне — у другім квартале.

Цана на газ вылічваецца ў залежнасці ад цаны на нафту паўгадавой даўніны. Паколькі цана на нафту ўпала пры канцы лета мінулага году ўтрая, то і цана на газ з другога кварталу пакоціцца ўніз.

Юлія Цімашэнка запэўніла, што Украіна адновіць транзіт газу, як толькі «Газпром» і «Нафтагаз» падпішуць адпаведнае пагадненне. Абедзве кампаніі — дзяржаўныя.

Пуцін і Цімашэнка дасягнулі ўгоды пасля суботняй канферэнцыі па пытаннях транзіту газу, што прайшла ў Маскве з удзелам прадстаўнікоў шэрагу еўрапейскіх краінаў, у тым ліку Беларусі.

У 2008 годзе Украіна плаціла $179,50 за 1000 кубаметраў газу. Еўрапейская цана на першы квартал 2009 году складае прыкладна $450.

**Пераход Украіны на аплату за газ па рынкавых цэнах паскорыць аналагічны працэс для Беларусі.**

Да зрыву перамоваў 31 снежня Расія прапаноўвала Украіне плаціць $250 праз увесь 2009 год. Украіна з ёю не пагаджалася. «Нафтагаз» быў гатовы на $235. Дык хто выйграў у выніку канфлікту?

Эксперты лічаць, што сярэдняя цана на газ у 2009 годзе складзе $260—300. Такім чынам, сярэднегадавая цана для Украіны будзе роўнай $208—240. Прытым Украіна частку першага кварталу карысталася ўласнымі запасамі газу, што дазволіць знізіць аб'ём экспарту па высокай цане.

Праўда, расцэнкі на транзіт застануцца ў 2009-м на ранейшым узроўні, які прадугледжваўся дамовай ад 2006 году. Украіна, нагадаем, хацела іх перагляду ў бок павышэння.

Ад 2010 году краіны маюць перайсці на еўрапейскія цэны на газ і транзіт — па цане Славаччыны за вылікам кошту транзіту праз Украіну. Фактычна, бакі па выніках вайны засталіся на ранейшых пазіцыях. Расіі не ўдалося навязаць Кіеву свае ўмовы гульні.

Пераход Украіны на аплату за газ па рынкавых цэнах паскорыць аналагічны працэс для Беларусі. Цана для нашай краіны за газ на гэты год, дарэчы, дагэтуль не абвяшчалася. Па ідэі, яна павінна быць ніжэйшай за ўкраінскую. «Газпром» дае Беларусі зніжку, бо наша краіна, у адрозненне ад Украіны, саступіла яму правa ўласнасці на газаразмеркавальныя сеткі — ААТ «Белтрансгаз».

Што датычыць Беларусі, дык своеасаблівым палітычным жэстам стала тое, што Аляксандр Лукашэнка ў аўторак сустрэўся ў Чарнігаве з Віктарам Ючшанкам, тады як на суботні саміт у Маскву лятаў не ён, а прэм'ер Сяргей Сідорскі.

**Мікола Бугай**




**Ах ты, мая дзюдзя...**
**Цэны на свініну на рынках выраслі на 20%. Кілаграм бакавіны на Камароўцы ў Мінску каштуе 14 500 рублёў.**

## Новая перабудова

**Кіраўнікі ўраду і Адміністрацыі прэзідэнта прынялі 15 студзеня план па лібералізацыі эканомікі.**

Пра гэта журналістам паведаміў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур перад пачаткам паседжання Рэспубліканскага клубу дырэктараў. План уключае 52 мерапрыемствы, што ўвайшлі ў 12 асноўных блокаў.

«Гэты дакумент закліканы працягнуць працэс захадаў ураду па стварэнні прававога поля для больш простага і ўраўнаважанага вядзення бізнесу», — адзначыў А.Тур.

Сярод асноўных блокаў плану ён назваў: заяўніцкі прынцып стварэння прадпрыемстваў, зняцце адміністрацыйных бар'ераў, спрашчэнне працэдур сертыфікацыі, узгадненняў з санітарнымі, супрацьпажарнымі інспекцыямі.

Сярод мерапрыемстваў — усталяванне долі малых прадпрыемстваў для ўдзелу ў дзяржаўных закупках, зняцце абмежаванняў на імпарт рыбы і інш.

**Паводле БелаПАН**

## Беларуская АЭС — блеф?

**Гэтага варыянту не выключае прэм'ер-міністр Літвы Андрус Кубілюс.**

Ён заявіў, што інфармацыя пра планы Беларусі, Польшчы і Расіі будаваць свае АЭС вакол Літвы можа быць усяго толькі камерцыйнай гульнёй.

«Усе гэтыя прыдумкі вакол — мы не перакананыя ў тым, што яны насамрэч рэальныя. Некаторыя з іх менавіта дзеля таго і прызначаныя, каб мы сабе паставілі такое пытанне — а для чаго Літве ўласная электрастанцыя, калі вакол нібы будуюцца ажно чатыры. Часам гэткія праекты, перадусім у нашых усходніх суседзяў, разглядаюцца адно дзеля таго, каб мы разгубіліся ў сваіх разважаннях, і гэта тармазіла б будаўніцтва стратэгічнага аб'екту — новае АЭС», — выказаўся Кубілюс у інтэрв'ю радыёстанцыі Lietuvos radijas.

Літоўскі прэм'ер кажа, што акурат суседзі Літвы мусяць добра задумацца пра свае магчымасці. У літоўцаў ёсць уласны досвед такога будаўніцтва. І Літва будзе будаваць новую АЭС, супольна з энергетычнымі кампаніямі Польшчы, Латвіі ды Эстоніі. АЭС магутнасцю 3400 мегават мае паўстаць у 2010—2021 гадах.

Беларускі ўрад абвясціў пра свае планы збудавання атамнай станцыі на самай мяжы з Літвой у рэкордна сціслыя тэрміны — да 2012 году.

Старую Ігналінскую АЭС зачыняюць, бо яна была збудаваная па расійскіх тэхналогіях, якія пасля Чарнобылю ў Еўропе лічаць ненадзейнымі. Новую АЭС у Літве маюць узвесці па тэхналогіях, што адпавядаюць стандартам ЕС.

Праўда, застаюцца пытанні па фінансаванні праекту. Варшава падраджаецца ўнесці ў яго трэцюю частку сродкаў толькі ў тым выпадку, калі трэцяя частка выпрацаванага станцыяй току пацячэ ў Польшчу.

**СХ**

## СЦІСЛА

### Сідорскі пераводзіць кацельні на мазут

Паводле распараджэння Саўміну ўсе прадпрыемствы, кацельні якіх могуць быць пераведзеныя з газу на мазут, мусяць зрабіць тое ад 1 лютага. Патрэба гэтага тлумачыцца ростам цэнаў на расійскі газ у першым квартале, а таксама задачай эканоміі валютных сродкаў.

Рэалізацыю даручэння дапільноўваюць выканкамы на месцах.

**МБ**

### Расійскі рубель працягвае падзенне

Курс амерыканскага даляра падбіраецца да 34 расійскіх рублёў.

Расійскі Цэнтрабанк паступова дэвальвуе рубель у суадносінах да бівалютнага кошыка. Ад Новага году рубель страціў ужо 12% свайго кошту.

Урад Расіі ўзважвае магчымасць перагляду бюджэту-2009 з разліку на сярэднегадавы курс рубля, роўны 35 за даляр. Гэта азначае, што рубель можа знізіцца да 38—40 рублёў за даляр да канца году, ці яшчэ больш — на 20%.

У такой сітуацыі дзіўнымі падаюцца размовы аб магчымай прывязцы беларускага рубля да расійскага.

**АГ**

# Кіем цэны акалочваюць

**Учора мой стандартны пакет купленых пасля працы харчоў пацягнуў тысяч на 15 болей, чым да новага году. Піша Аляксандр Класкоўскі.**

Прыйшоў дадому, шчоўкнуў тэлевізар (памятаеце анекдот: «Хачу жыць у той Беларусі, што па ТБ паказваюць»): нашы дзеячы даводзяць, што ніякіх эканамічных прычын для істотнага росту цэнаў няма. Можа, для іх гэта і неістотна...

Калі ж сур'ёзна, то, па-першае, такія прычыны ёсць. Хаця б таму, што імпартны складнік (і часам ладны) прысутнічае ці не ў кожным айчынным тавары.

А звыш таго эканоміка — гэта яшчэ і псіхалогія. Фінансы — дык суцэльная псіхалогія. Таму Лукашэнка літаральна моліць народ, каб не пёр у банкі забіраць грошы з дэпазітаў.

Публіка ўспрыняла шокавую дэвальвацыю як «кідалава», прычым не апошняе. Таму камерсанты закладаюць цяпер у цэннік не толькі +20%, але і свае чаканні новых сюрпрызаў, імаверныя рызыкі. Ну а хто-кольвек — не без гэтага — проста вырашыў палавіць рыбку ў мутнай вадзе.

Карацей, пры падрыхтоўцы аперацыі «Дэвальвацыя» ўлады пралічылі ўсё, акрамя псіхалагічнай рэакцыі на «кідалава». Падзеі пайшлі па найгоршым сцэнары. Спачатку — хваля ажыятажнага попыту, штурм абменнікаў, цяпер вось — інфляцыйны выбух.

Ад новага году цэны на шэраг прадуктаў падскочылі на 40—65% (гэта не аўтарскі суб'ектыў, а звесткі Мінэканомікі). Значна падаражэлі крупы, алей, рыба, мандарыны, чай, кава...

Чыноўнікі звыкла спрабуюць акалочваць тыя завоблачныя цэны кіем праверак ды пакаранняў. Пагражаюць пазбавіць ліцэнзій.

Невядомая гандлярка са сталічнага рынку «Ракаўскі» ўвайшла ў аналы: трапіла ў справаздачу дзяржаўнага агенцтва. Праваравальнікі выявілі, што кабета завысіла цану бельгійскіх груш аж на 30%.

Пра цэнавы выбух заклапочана гаварылі 15 студзеня Сідорскі з Лукашэнкам. Іронія лёсу ў тым, што ў звязку з разрэкламаванай лібералізацыяй урад ад сёлета не мусіць займацца рэгуляваннем цэн, акрамя тых, што тычацца «сацыяльна значных тавараў». У снежні выйшаў указ пра мараторый на праверкі.

Але народ стаіць на вушах, шалее ад цэннікаў. Таму ўрад мусіць зноў шчоўкаць пугай. Праверкі сарамліва называюць «пунктавымі», але ўсё адно яны яўна дысануюць з указам № 689. І ўлада хоча, каб бізнес ёй верыў?

**Улады спяшаюцца правесці рэформы пад дыктоўку «жулля з МВФ».**

Канечне, тут нічога не дакажаш: тым, хто трапіць пад раздачу, не пашанцуе. Цётка-гандлярка сто разоў пракляне бельгійскія грушы...

Але па вялікім рахунку выйдзе — пугай па вадзе.

На пачатку прэзідэнцтва афіцыйны лідэр ужо спрабаваў адкруціць цэны. Інфляцыйны не слухалася, але ратаваў датацыйны рэсурс, расійскі грант. Цяпер вось, не маючы рэсурсаў, вертыкаль зноў спрабуе акалочваць цэны адміністрацыйна-карным кіем. Гісторыя паўтараецца ў выглядзе фарсу.

Аксіёма: у рынкавай эканоміцы ўладам належыць уплываць на цэны праз тонкі інструментарый — крэдытна-грашовую палітыку, развіццё канкурэнцыі. Але ж хто гэтаму вучыў? Ды і механізмы адпаведныя за адну ноч не ствараюцца.

На 2009 год урад заклаў у план інфляцыю 9—11%. Незалежныя эканамісты прагназуюць утрая большую.

Джын выпушчаны са жбана. Разам з тым, усталяваць рынкавую эканоміку за пару тыдняў не пад сілу нават геніям рэфарматарства. А наверсе ж не ўсе такія.

Кіроўная вярхоўка расплочваецца за гады блізарукай балотнай «стабільнасці», калі банальнае эканамічнае рэтраградства выдавалася за вялікую дзяржаўную мудрасць.

Рэформы было б найменей балюча зладзіць на піку энергетычнай дурніцы, калі Расія была яшчэ «шчодрай душой». А так вось даводзіцца цяпер цапом-лапом, пад дыктоўку «жулля з МВФ». Дарэчы, класічны прыклад з серыі «не плюй у калодзеж».

# «Паўстае пытанне аб пакіданні пасады Лукашэнкам»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ першай з партый дала ацэнку фінансава-эканамічнаму крызісу ў краіне. Яе кіраўніцтва прыняло адпаведную заяву.**

«У Беларусі працягваецца фінансава-эканамічны крызіс, які дзень у дзень пагаршае становішча краіны і людзей. Крызіс пачаўся на Захадзе, але непасрэдна прыйшоў да нас з Расіі і з'явіўся вынікам антынацыянальнай і эканамічна неадэкватнай палітыкі кіроўнага рэжыму ў Беларусі».

Паводле КХП-БНФ, «кіроўная група ўлады цалкам нясе адказнасць за цяжкія праявы крызісу ў краіне і ў значнай ступені вінаватая за яго ўзнікненне і за разбуральны працяг, бо праводзіла згубную і неадпаведную эканамічную палітыку. Ёсць вялікія сумненні, што гэтая палітыка будзе зменена і што існуючае кіраўніцтва краіны здольнае вывесці Беларусь з крызісу з найменшымі стратамі. На парадку дня паўстае пытанне аб пакіданні пасады Аляксандрам Лукашэнкам. Сітуацыя патрабуе змены ўсёй эканамічнай палітыкі на карысць нацыянальных інтарэсаў, ставіць задачу кардынальных пераменаў у сістэме ўлады».

# Беларуская мова мае права на пошласць

**Беларуская мова не можа быць поўнай, пакуль не ахопіць сабой усе сферы — у тым ліку і самыя нізавыя. Піша Андрэй Расінскі.**

У артыкуле «Грамадства неананімных алкаголікаў, і дзякуй ТВ» (№2, 2009) Наталка Бабіна рэзка выказалася пра навагоднюю «Батлейку» — дый пра тэлевізію ўвогуле. Як і спадарыня Бабіна, я не ў захапленні ад перадачы, а тэлевізар гляджу збольшага з абавязку, амаль без надзеі на інфармацыю і мастацкую асалоду.

Але мушу выказаць нязгоду з водгукам.

Першая памылка, якой грашыць і аўтар гэных радкоў, — інтэлектуальны снабізм. Нам падавай шэдэўры, творы выключныя, якія цешылі б вытанчаныя густы і здзіўлялі б глыбінёй. Але культура не складаецца з адных толькі вяршыняў. Нармальнае існаванне культуры абавязкова прадугледжвае і звыклую штампоўку, без якой немагчымыя шэдэўры.

Болей за тое, тэлевізія як масавая забаўка мае права на сваё смецце. Хаця ў ідэале тэлевізія — таксама і месца грамадскіх дыскусій, сродак адукацыі і выхавання.

Так, расійская і беларуская тэлевізія асядлалі хлуд, кормяць гледачоў благім гумарам і звяглівай прапагандай. Але хлуд сам па сабе — неад'емная частка культурнай дынамікі; пазбавіцца ад яго немагчыма, ён ёсць.

Так, у кадрах «Батлейкі» пазнаецца моцная рука аўтаркі незабыўнай «Паўлінкі-new», залімітнай па сваёй безгустоўнасці. Але гэная навагодняя «Батлейка» ўпершыню — цалкам і напоўніцу беларускамоўная.

Помніцца, вялікае абурэнне выклікалі заклікі, што беларуская мова адродзіцца, калі на ёй будуць размаўляць прастытуткі. «Як?! Каб шлюндры паскудзілі святую беларускую мову? Ды ніколі! Прынцэсы не какаюць!»

Какаюць.

І для гэтага мусяць быць свае словы.

Беларуская мова мае права на сваю пошласць. Нам вельмі хацелася б, каб творы на беларускай мове былі спрэс высокамастацкімі. Але беларуская мова не можа быць поўнай, пакуль не ахопіць сабой усе сферы — у тым ліку і самыя нізавыя.

І няхай нас ванітуе ад кічавых «Батлеек». Але нават апошнія алкаголікі цяпер пачулі беларускую мову — і прызналі яе сваёй.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Свой катэдж міністр Навумаў ужо дабудаваў

Міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў публічна паабяцаў, што ўсе супрацоўнікі МУС, якія незаконна пабудавалі сабе катэджы пад Мінскам, будуць звольненыя з органаў.

Маёмасць жа ўжо канфіскаваная на карысць дзяржавы.

Нагадаем, што два намеснікі міністра Аляксандр Шчурко і Віктар Філістовіч, начальнік дэпартаменту фінансаў і тылу Віктар Мельнікаў, начальнік дэпартаменту па міграцыі і грамадзянстве Лідзія Іванчыкава былі вызваленыя ад сваіх пасад і залічаныя ў распараджэнне міністра Навумава.

«Мая віна ў гэтай справе адзначана папярэджаннем ад прэзідэнта», — сказаў У.Навумаў.

А ці не вельмі гэта мяккае пакаранне, пацікавіліся журналісты? «Я не з тых людзей, якія просяць сябе пакараць», — адказаў міністр.

Пацікавіліся ў Навумава і тым, ці дабудаваў ён свой катэдж. Так, дабудаваў. Браў на гэтыя мэты крэдыт 75 тысяч даляраў, яшчэ не расплаціўся з ім.

**ЗП**

**Навумаў абяцае раскрыць выбух 4 ліпеня і хоча адкатаць пальчыкі ўсяму насельніцтву**

Міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў зазначыў, што афішаванне хады следства па выбуху на Дзень Рэспублікі можа абцяжарыць расследаванне.

«Я не ведаю ніводнай краіны, дзе б праваахоўныя органы з перыядычнасцю інфармавалі СМІ аб падобных злачынствах. Справа будзе раскрытая, у мяне няма сумневаў», — сказаў У.Навумаў.

Што датычыць дактыласкапічнай рэгістрацыі, то кіраўнік МУС унёс хадайніцтва ў Раду Бяспекі і Савет міністраў адносна змянення закону. Паводле папраўак абавязковую дактыласкапію будуць праходзіць не толькі прызыўнікі, але і ўсе ваеннаабавязаныя, то бок большая частка беларускіх мужчын.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# 29 прабітых колаў

За 2008 год лідэру Руху за Свабоду Аляксандру Мілінкевічу аж 29 разоў прабівалі колы ў машынах.



АНДРЭЙ ПАНКЕВІЧ

«Гэта толькі тыя здарэнні, калі даводзілася мяняць шыны, а колькі яшчэ было выпадкаў, калі ўдавалася папярэдзіць праколы», — кажа намеснік Мілінкевіча Юрась Губарэвіч.

Большасць падобных інцыдэнтаў адбываліся падчас паездак палітыка па рэгіёнах.

Найцікавейшы выпадак адбыўся ў Слоніме, калі ў машыне прабілі тры колы проста ў міліцэйскім дворыку.

А аднойчы ў Берштах, на малой радзіме палітыка, зламыснікі так стараліся, што прабілі кола не толькі ў Мілінкевічавай, а нават у суседскай машыне.

Яшчэ двойчы летась аўтамабіль экс-кандыдата на пасаду прэзідэнта залівалі фарбай.

Такая ў краіне пануе законнасць і такія спосабы барацьбы з палітычнымі праціўнікамі.

**Зміцер Панкавец**

# Урад запрасіў Літвіну і Сярэдзіча ў Каардынацыйную раду па СМІ

16 студзеня старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Жанне Літвіной, а таксама галоўнаму рэдактару «Народнай волі» Іосіфу Сярэдзічу было афіцыйна прапанавана ўвайсці ў склад грамадскай каардынацыйнай рады ў сферы масавай інфармацыі.

«Напярэдадні да мяне патэлефанаваў міністр інфармацыі сп.Русакевіч, які звярнуўся з падобнай прапановай. А ў пятніцу быў атрыманы афіцыйны ліст з Савету міністраў», — кажа І.Сярэдзіч.

Галоўны рэдактар «Народнай волі» прыняў без асаблівых роздумаў гэтую прапанову.

«А якія падставы адмаўляцца? Калі нешта не спадабаецца, то заўсёды можна махнуць рукой і сысці», — кажа ён.

Іосіф Сярэдзіч яшчэ не ведае, якія менавіта пытанні будуць разглядацца падчас працы рады. «Паколькі гэтая рада грамадская, то, натуральна, ніякія законапраекты мы прымаць не будзем. Я іду туды з канкрэтнымі прапановамі. Найперш мяне абурае тое, што нават праз 10 гадоў любы валацуга можа падаць у суд на газету, калі пабачыць там нейкую абразу на сябе. Гэтае становішча мяне хвалюе найбольш», — кажа І.Сярэдзіч.

«Быў бы ідэальны варыянт, калі б рада (калі яна будзе на нешта ўплываць) прыняла да разгляду пытанне роўных эканамічных умоваў для СМІ рознай формы ўласнасці, доступу да інфармацыі, прывядзення ў адпаведнасць з міжнароднымі нормамі і стандартамі закону аб СМІ, калі б у паўнамоцтвах рады былі такія пытанні, як перарэгістрацыя, стварэнне цывілізаванага медыярынку... Але ўсё гэта пакажа час», — прыводзіць словы Жанны Літвіной сайт БАЖу. Загад аб стварэнні каардынацыйнай рады па СМІ быў падпісаны яшчэ напрыканцы кастрычніка. Асноўнымі задачамі рады з'яўляюцца: каардынацыя ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў і іншых арганізацый, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць у сферы масавай інфармацыі; забеспячэнне правільнага ўжытку нормаў закону аб СМІ; разгляд спрэчных пытанняў, датычных прымянення гэтага закону і іншага заканадаўства ў сферы СМІ.

Запрашэнне Літвіной і Сярэдзіча нагадвае ўваходжанне Яраслава Раманчука і Андрэя Вардамацкага ў міжведамасную працоўную групу па краінавым маркетынгу.

**ЗП**

# Ніякіх асацыяцый?

Дыктатар Паўночнай Карэі выбраў пераемнікам свайго трэцяга сына.



Як паведамляюць паўднёвакарэйскія СМІ, кіраўнік КНДР Кім Чэн Ір назваў пераемнікам свайго трэцяга сына Кім Чэн Ына і накіраваў указ пра яго вылучэнне ў кіраўніцтва кіроўнай Працоўнай партыі.

Кім Чэн Іру цяпер 67 гадоў, і ён, на думку замежных СМІ, моцна хворы, у жніўні перанёс інсульт.

Кім Чэн Ыну 25 гадоў, ён народжаны ад трэцяй жонкі лідэра КНДР — яна памерла ў 2004 г.

Гэта не першы выпадак перадачы ўлады ў камуністычнай Карэі ў спадчыну. У 1974 г. Кім Ір Сэн назваў менавіта свайго сына Кім Чэн Іра пераемнікам. Апошні ўзначаліў краіну пасля смерці бацькі ў 1994 г.

Гавораць, што ў некаторых сыноў Кім Чэн Іра вялікія праблемы з здароўем.

**МБ**

## СЦІСЛА

### Мартынаў паедзе ў Брусель

26 студзеня ў Брусэлі пройдзе сустрэча кіраўніка МЗС Беларусі Сяргея Мартынава з прадстаўнікамі еўраструктур — гэтак званай «тройкай» (міністр замежных справаў краіны, якая старшынюе ў ЕС — цяпер гэта Чэхія — вярхоўны прадстаўнік Рады ЕС і камісар ЕС па замежнай палітыцы).

### Пяткевіч упаўнаважаная заявіць

Першая намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч у размове з карэспандэнтам БЕЛТА абвергла інфармацыю аб тым, што ў краіне рыхтуецца законапраект аб змяненні пенсійнага ўзросту.

### Еўрапарламент прыняў рэзалюцыю па Беларусі

У рэзалюцыі гаворыцца, што дзеля значнага паляпшэння адносінаў з ЕС Беларусь павінна заставацца краінай без палітвязняў, урад павінен гарантаваць свабоду СМІ, працягваць супрацоўніцтва з АБСЕ ў рэформе выбарчага заканадаўства, паляпшаць умовы для дзейнасці няўрадавых арганізацый, гарантаваць свабоду сходаў і палітычных асацыяцый. 559 еўрапарламентарыяў падтрымалі яе, 15 прагаласавалі супраць.

На дэбатах выступілі каля 20 парламентарыяў. Найбольш актыўна бралі ўдзел у дыскусіі сябры польскай дэлегацыі.

### Новы кіраўнік ДАІ

Палкоўнік міліцыі Васіль Бульбянкоў прызначаны на пасаду начальніка Упраўлення ДАІ Беларусі. Былы начальнік ДАІ Аляксандр Мендзелеў быў адхілены ад пасады ў лістападзе. «Цяпер Мендзелеў працуе маім памочнікам. Ён добры спецыяліст, але патрабавальнасці ў яго малавата», — сказаў журналістам міністр унутраных справаў У.Навумаў.

**ЗП; БелаПАН**

# Кроў і газ

**Цягам апошніх тыдняў тэлегледачам на самых розных каналах прапанавалася на выбар два галоўных шоу. Адно з іх, у жанры трагедыі, — вайсковая аперацыя Ізраілю ў сектары Газа. Другое, драма з элементамі камедыі, — газавая вайна паміж Расіяй і Украінай. Піша Віталь Тарас.**

Абедзве кампаніі пачаліся і завяршаюцца амаль сінхронна. Аднак, апрача супадзення ў часе і выпадковага падабенства словаў «газ» і «Газа», ёсць і іншыя падставы параўнаць гэтыя два канфлікты.

### Свінец яшчэ не астыў

Цікава, што б зрабілі брытанцы са сваім урадам, калі б у адказ на бамбаванне ангельскіх гарадоў нямецкімі ракетамі «Фаў-2» ён пайшоў бы на мірныя перамовы з нацысцкай Германіяй? Мабыць, сёння апраўданне для Вялікай Брытаніі і іншых еўрапейскіх краін у тым, што хамасаўскія ракеты «Касам» далей ізраільскіх гарадоў не далятаюць?

Падчас вайны ў Англію эмігравалі бацькі цяперашняга міністра замежных справаў Вялікабрытаніі Дэвіда Мілібэнда. Яны былі яўрэямі і мусілі ўцякаць ад нацыстаў з акупаванай Бельгіі. Тады, у 1940-м, Англія яшчэ толькі прыглядалася да Гітлера, з якім разам з Францыяй вяла «дзіўную вайну» — без адзінага стрэлу.

Сёння Захад таксама вядзе дзіўную вайну з тэрарызмам. Мілібэнд лічыць сам тэрмін «вайна з тэрарызмам» памылковым і асуджае спробы Ізраілю бараніцца ад тэрору сілай.

Еўрапейская паліткарэктнасць апошнім часам выглядае даволі аднабаковай.

Нядаўна імя Мілібэнда, побач з імем культавай спявачкі Эмі Вайнхаўз, апынулася на чале «расстрэльнага спісу», апублікаванага на сайце брытанскіх мусульман «Ума».

У Нарвегіі падчас нямецкай акупацыі кароль Хокан VII заслужыў пашану суайчыннікаў тым, што апрануў жоўтую павязку з зоркай Давіда на знак салідарнасці з яўрэямі, якіх фашысты адпраўлялі на смерць. Сёння міністр фінансаў Нарвегіі Крыстын Харвальдсэн бярэ ўдзел у маніфестацыі ля пасольства Ізраілю ў Осла пад антыізраільскімі лозунгамі.

Прафсаюзныя дзеячы ў Рыме заклікаюць да байкоту ізраільскіх тавараў і яўрэйскіх крамаў, у Іспаніі экстрэмісты атакуюць ізраільскае пасольства, у Францыі апаганьваюць сінагогі. І ўдзельнічаюць у гэтым не толькі арабы.

Праявы антысемітызму ў Еўропе — даўно не навіна для Ізраілю, як і пазіцыя многіх еўрапейскіх лідэраў. Яны лічаць, што адказ на абстрэлы «Хамас» быў «непрапарцыйным».

За 60 гадоў пасля свайго абвяшчэння Ізраіль без чыёйсьці дапамогі, фактычна ў поўнай адзіноце выйграў некалькі войнаў з арабскімі дзяржавамі на Блізкім Усходзе, якія падтрымліваў



**Стаўка Масквы ў канфлікце з Кіевам была большай, чым цана на газ.**

Савецкі Саюз. А інакш — як выжыць, калі арабскае атачэнне, ды ўвесь мусульманскі свет ставяць пад сумнеў само існаванне ізраільскай дзяржавы? Араба-ізраільскі канфлікт, які пачаўся ў мінулым стагоддзі, наўрад ці скончыцца ў гэтым.

Узаемнай нянавісці паміж палестынцамі і яўрэямі ў выніку аперацыі «Расплаўлены свінец», безумоўна, стала яшчэ больш. Са свінцу, як вядома, адліваюць кулі. З імклівым ростам насельніцтва Газы хутка падрасце новае пакаленне палестынцаў, гатовых страляць у ізраільцянаў. А «Хамас» гатовы змагацца з ненавісным Ізраілем да апошняга палестынца. Так што казаць, што нехта ў гэтай вайне перамог, будзе цынізмам.

Калі можна вынесці нейкі пазітыўны ўрок з апошняй вайны — дык гэта тое, што ва ўмовах замежнай пагрозы нацыя здольная кансалідавацца. Але пры гэтым, што вельмі важна, не адмаўляючыся ад дэмакратыі. У Ізраілі ёсць свае пацыфісты, і ніхто ім не перашкаджаў выходзіць, як і ў Еўропе, на антываенныя дэманстрацыі. Проста яны апынуліся ў яўнай меншасці. Сёлета ў лютым павінны адбыцца дэмакратычныя выбары ў кнесэт. Ні міжпартыйныя супярэчнасці, ні асабістыя палітычныя амбіцыі не перашкодзілі лідэру левай Партыі працы, міністру абароны Эхуду Бараку, узяць на сябе адказнасць за правядзенне вайсковай аперацыі «ЦАХАЛ», а прэм'ер-міністру правай Кадзімы Эхуду Ольмерту і міністру замежных справаў Цыпі Ліўні — аказаць максімальную палітычную і дыпламатычную падтрымку будучаму палітычнаму спаборніку.

### Дзіўная вайна на Усходзе

Расійскае кіраўніцтва ў газавым канфлікце з Украінай таксама кіравалася, мабыць, інтарэсамі дзяржавы. Праўда, яно ні ў кога не пыталася, ці патрэбны гэты канфлікт расійцам, украінцам, жыхарам Еўропы. Ніякія выбары існаванню крамлёўскай тандэмакратыі не пагражаюць.

Як вядома, «Газпром» у Расіі больш, чым «Газпром». Той факт, што гэтая кампанія страціла ў выніку транзітнай спрэчкі з Украінай больш за мільярд даляраў, сам па сабе гаворыць пра тое, што справа тут не ў камерцыі. Тым больш, што рэпутацыйныя страты Расіі, якія яна панесла ў вачах Захаду, цяжка нават падлічыць.

Ад самага пачатку стаўка Масквы ў канфлікце з Кіевам была большай, чым цана на газ.

Піяр-кампанію вакол новага кантракту «Газпром» пачаў у Еўропе задоўга да правалу перамоваў з «Нафтагазам». Ва Украіне гэта бачылі, канфлікт прадчувалі і падрыхтаваліся да яго, як ніколі раней — загадзя да краёў запоўнілі свае газавыя сховішчы, каб пратрымацца, у выпадку неабходнасці, некалькі месяцаў.

Разлік Крамлю, відаць, быў на тое, што палітычны раздрай ва Украіне, і ў першую чаргу — канфлікт паміж былымі лідэрамі «аранжавай рэвалюцыі» Юшчанкам і Цімашэнка зробіць украінскі бок няздольным супрацьстаяць газаваму дыктату. Ад самага пачатку Крамлю важны быў не столькі эканамічны, колькі палітычны вынік. Там разлічвалі на дэстабілізацыю ўсяго жыцця ва Украіне на фоне цяжкага эканамічнага крызісу, які па ўкраінцах ударыў яшчэ больш балюча, чым па Расіі.

Але пры ўсіх замежнапалітычных памылках, пры ўсіх хістаннях у палітыцы ўнутранай, украінская эліта ў цэлым праявіла сябе кансалідаванай у адстойванні нацыянальных інтарэсаў. І прапагандысцкі ўдар Масквы Кіеў трымаў, ажно пакуль Пуцін не пагадзіўся на больш прымальныя для Украіны ўмовы платы за газ.

Тут таксама важнай падаецца пазіцыя Еўропы. Як і ў выпадку з араба-палестынскім канфліктам, ЕС паспрабаваў заняць, так бы мовіць, роўнааддзеглую пазіцыю ў адносінах да абодвух бакоў. Маўляў — абое рабое, вы там дамаўляйцеся паміж сабой, а мы пачакаем. Пазіцыі расійскага газавага манапаліста спачатку падаваліся еўрапейцам больш надзейнымі, а паводзіны Украіны — занадта брутальнымі. Таму Еўракамісія не спяшалася ціснуць на Расію, хоць пагадзілася прысланць сваіх назіральнікаў.

Масква, насамрэч, магла разлічваць на поспех у канфлікце з Кіевам. Улетку мінулага году, падчас узброенага канфлікту Расіі з Грузіяй, Еўропа фактычна прынесла ў ахвяру стабільным адносінам з Масквой і «надзейным пастаўкам» газу еўраатлантычную салідарнасць, а таксама непарушнасць пасляваенных межаў і тэрытарыяльную цэласнасць краін-сяброў АБСЕ. Адчуўшы слабіну еўрапейскай дэмакратыі, а можа, пераацаніўшы гнуткасць еўрапейскіх палітыкаў, Масква пасля паходу на Поўдзень вырашыла зрабіць «кідок на Захад», каб даць прадметны ўрок кіраўніцтву Украіны. І тым самым прадэманстраваць усім, хто ёсць гаспадар на постсавецкай прасторы.

На дыпламатычную дапамогу Украіне зноў, як і ў выпадку з Грузіяй, прыйшлі новыя краіны ЕС — у прыватнасці, Чэхія, якая цяпер у ім старшынюе. Афіцыйная заява з боку польскага МЗС у падтрымку Украіны таксама мела значэнне. Ва ўмовах глабальнага эканамічнага крызісу дэманстраваць канфлікты ўнутры Еўрасаюзу, ды яшчэ саступаць яўнаму шантажу Расіі — занадта дарагое задавальненне. Еўропе, хочаш не хочаш, давялося выпрацоўваць супольную пазіцыю ў адносінах да «чужога» канфлікту.

Ну а Расія, трэба думаць, не забудзе крыўды, нанесенай «Газпрому», — галоўнаму сімвалу сваёй дзяржаўнай велічы. Так што працяг канфлікту з Украінай мы пабачым у не надта далёкай перспектыве.

# Кагнітыўны дысананс

**Аляксандр Зімоўскі на naviny.by пра ідэалагічны паварот беларускіх уладаў: катэгарычная адсутнасць крызісу ў Беларусі змяніла суверэнную дзяржаву ў цэнтры Еўропы трохі больш чым поўнасцю.**

На маю думку, толькі гэтае назвы [кагнітыўны дысананс] заслугоўвае ўсё сямейства аналітычных праграмаў шматканальнага беларускага тэлебачання заўтрашняга дня, што ідзе на змену нашумелай праграме «Рэзананс»™. Прафесійнае чуццё, якога мне не бракуе, падказвае, што ў найбліжэйшыя год-два кагнітыўны дысананс, як норма жыцця, увойдзе ў кожную моцную беларускую сям'ю. Хаця б таму, што кожная моцная беларуская сям'я марыць пра моцную беларускую дзяржаву.

Вярнуўшыся з адпачынку, я не мог не заўважыць, што катэгарычная адсутнасць крызісу ў Беларусі змяніла суверэнную дзяржаву ў цэнтры Еўропы трохі больш чым поўнасцю. Дальбог, больш, чым Вялікая дэпрэсія змяніла Злучаныя Штаты Амерыкі.

Прыкметы новага заўважаеш літаральна на кожным кроку. Вось, калі ласка, з духоўнага жыцця. У глухія дні апошняй дыктатуры Еўропы паэт В.А.Шніп пісаў: «Аднаго сабаку Граждан убачыў пераапранутым у жанчыну і адразу пацікавіўся: «Можна я вам байстручка зраблю?». А сабака і адказаў: «На гэты год мы план ужо выканалі...». А цяпер паэт В.А.Шніп атрымлівае з рук Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі спецыяльную прэмію Кіраўніка дзяржавы. Мае віншаванні, дарэчы.

**naviny.by**



# Вольскі і Пугач запісалі патрыятычны дуэт

присвечаны рэкам і азёрам Беларусі.

Адбылося гэта ў межах супольнага музычнага рэтрапраекту ў стылістыцы 1950—1970-х, рэліз якога на дысках адбудзецца ў лютым.

Песня завецца «Такога няма нідзе». Напісаў яе, як і астатнія кампазіцыі праекту, Лявон Вольскі. «Наогул дыск атрымаўся вельмі несур'ёзны, — тлумачыць аўтар. — Гэта альбом стылізацый. На ім ёсць Фрэнк Сінатра і Эдыт Піяф, кітайскія матывы і некалькі рок-н-ролаў. А песня з Валодзем Пугачам — гэта такі рамантычна-патрыятычны беларускі варыянт Beatles».

Кампазіцыя прысвечана любові да беларускіх азёраў і рэк, прычым у тэксце згадана шмат назваў — ад Нёмана да Ясельды, ад Нарачы да Свіцязі. «Ідэя запісаць нешта з Пугачам была даволі даўно, але не было песні, — гаворыць Вольскі. — А тутака ўсё неяк адразу атрымалася на сто працэнтаў — і з музычнага боку, і нават, так бы мовіць, з ідэалагічнага. Валодзя нарадзіўся і вырас на Палессі ды яшчэ з'яўляецца вядомым аматарам адпачынку на Галубых азёрах».

Уладзімір Пугач пагадзіўся на дуэт без ваганняў. «Перш за ўсё таму, што гэта прыгожая песня, — прызнаецца ён. — Яна складзена з простых словаў і простых эмоцый. Яе можна назваць патрыятычнай, але гэты патрыятызм не агрэсіўны і надуманы, як гэта часцяком бывае. Ён вельмі жыццёвы і чалавечны. Мне гэта вельмі спадабалася».

Песню можна спампаваць на асабістым ЖЖ Лявона Вольскага і афіцыйным сайце J:морс (www.jmors.by).

Сярод іншых удзельнікаў праекту — Павел Булатнікаў («Ляпіс Трубяцкой»), Віталік Артыст («Без білета»), Ганна Хітрык («ДзеціДзяцей»), акцёры Алег Гарбуз, Святлана Зелянкоўская ды інш.

**Сяргей Будкін**

# Ганчарэнка ў сусветнай эліце

**Міжнародная федэрацыя футбольнай гісторыі і статыстыкі абнародавала рэйтынг найлепшых клубных трэнераў за 2008 год.**

Узначаліў спіс 25-ці найлепшых сэр Алекс Фергюсан, які сёлета прывёў «Манчэстэр Юнайтэд» да семнаццатай перамогі клубу ў чэмпіянаце Англіі і трэцяй у Лізе чэмпіёнаў. У шатландскага спецыяліста 264 пункты.

Другое месца заняў трэнер «Зеніту», галандзец Дзік Адвакат. У траўні 2008 г. піцерскі клуб выйграў Кубак УЕФА, а ў жніўні — Суперкубак Еўропы. У Адваката 144 балы.

Трэцяе месца — у трэнера пераможцы Кубке Лібертадорэс ЛДУ (Кіта, Эквадор) Эдгарда Баўсы (44 балы).

Галоўны трэнер барысаўскага БАТЭ Віктар Ганчарэнка разам з трэнерам кіпрскага «Анортасісу» Цемурам Кецбая падзяліў 17—18-я месцы.

Абодва трэнеры набралі па 9 балаў.

Перад імі: Арсен Венгер («Арсенал»), Рафаэль Бэнітэс («Ліверпуль»), экс-трэнеры «Чэлсі» і «Інтэра» Аўраам Грант і Раберта Манчыні.

Сённяшні трэнер «Інтэра» Жазэ Мурыньё на 15-м месцы, Лучана Спалеці («Рома») — на 16-м.

Ганчарэнка і Кецбая затое абагналі трэнера «Ювентусу» Клаўдыё Раньеры, «Фіярэнціны» Чэзарэ Прандэлі, Хаўера Агірэ («Атлетыка» Мадрыд).

**АГ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Стары замак у Гродне набудзе выгляд з часоў Батуры

**Ён будзе адрэстаўраваны ў выглядзе каралеўскай рэзідэнцыі, якой ён быў у XVI стагоддзі.**

Аб гэтым паведаміў аўтар і навуковы кіраўнік праекту рэстаўрацыі, архітэктар УП «Гроднаграмадзянпраект» Уладзімір Бачкоў.

Згодна з дэталёвым планам рэстаўрацыі, які Уладзімір Бачкоў распрацаваў яшчэ каля 20 гадоў таму, палова замка (галоўны будынак з вежамі) магла быць адноўлена ў выглядзе рэзідэнцыі караля Рэчы Паспалітай Сцяпана Батуры.

Спецыяльна для караля ў 1580 годзе паводле праекту італьянскага архітэктара Санці Гучы замак быў перабудаваны: увянчаны дэкаратыўным атыкам, упрыгожаны рэнесанснымі архітэктурнымі дэталямі, разным арнаментам.

Другую палову замка Бачкоў задумваў аднавіць у тым выглядзе, у якім ён існаваў у XII стагоддзі: аднавіць драўляныя галерэі сцен, аднавіць Ніжнюю царкву. Паміж часткамі замка планавалася размясціць шкляны павільён, які ўмясціў бы ў сябе археалагічную экспазіцыю.

Аднак ад рашэння сумясціць у гродзенскім замку розныя стагоддзі ў выніку вырашана адмовіцца: замак будзе цалкам адноўлены як рэзідэнцыя Сцяпана Батуры.

Каралеўскі палац будзе ўпрыгожаны атыкам з грэбнем. Па цэнтры палацавага фасаду размесцяцца аркадная лоджыя. Фасады набудуць багатыя рэльефныя формы дзякуючы часаным дэталям з пясчаніку з выкарыстаннем тэхнікі графіта. Замак увянчаюць дзве вежы, Сярэдняя і Вуглавая, над уязной брамай з'явіцца купал. Унутранае ўбранне будзе адпавядаць узроўню каралеўскай рэзідэнцыі. Італьянская столь будзе ўпрыгожана разьбой і паліхраміяй. З'явяцца габелены, печы, каміны.

Ніжняя царква XII стагоддзя падлягае кансервацыі і будзе экспанавацца ў тым выглядзе, у якім яна захавалася да нашага часу.

Паводле словаў Уладзіміра Бачкова, праект рэстаўрацыі разбіты на чэргі. На сёння выканана 10 працэнтаў праектных работ. Кожны этап будзе праходзіць экспертызу і зацвярджэнне ў Міністэрстве культуры.

**Паводле БЕЛТА**



DARRIUSS.LIVEJOURNAL.COM

**Макет каралеўскага замку.**

# Міхалевіч пойдзе ў прэзідэнты

Выключаны з Партыі БНФ Алесь Міхалевіч стаў другім, пасля Аляксандра Мілінкевіча, палітыкам, які заявіў пра свой удзел у прэзідэнцкіх выбарах-2011.

Пра гэта Міхалевіч паведаміў на канферэнцыі ва ўкраінскім Чарнігаве, якая праходзіла 10—11 студзеня. Большасць удзельнікаў канферэнцыі складалі рэгіянальныя і сталічныя актывісты Руху за Свабоду — Алесь Зарамбюк, Яраслаў Берніковіч, Сяргей Салаш, Зміцер Кухлей, Юры Карэтнікаў, Юрась Губарэвіч і іншыя.

Алесь Міхалевіч заявіў, што не збіраецца перацягваць людскія рэсурсы ад Мілінкевіча і замінаць ягонай выбарчай кампаніі. Адзінае, што ён папрасіў ва ўдзельнікаў, — кантакты мясцовых настаўнікаў. Міхалевіч не выключае магчымасці, што пасля рэгістрацыі здымецца з гонкі на карысць Мілінкевіча.

Некаторыя з прысутных у Чарнігаве не выключаюць, што Міхалевіч ідзе на найбліжэйшыя выбары з разлікам на 2015 год, і будзе выкарыстоўваць гэтую кампанію для ўласнай раскруткі.

**Зміцер Панкавец**



**Алесь Міхалевіч**

нарадзіўся 15 траўня 1975 у Мінску. Скончыў БДУ (1997), спецыяльнасць — паліталогія. У 1993 уступіў у Партыю БНФ, быў адным з заснавальнікаў Задзіночання беларускіх студэнтаў. Меў намеснікам старшыні партыі, але ўрэшце яго выключылі з БНФ «за публічную крытыку кіраўніцтва партыі».

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# КДБ вербуе праз vkontakte.ru

але паводле палітычных матываў. Некалькі студэнтаў у розных гарадах разгаласілі факт шантажу.


VKONTAKTE.RU

Два супрацоўнікі КДБ у панядзелак спрабавалі завербаваць студэнта-першакурсніка Універсітэту інфарматыкі і радыёэлектронікі Паўла Ляшковіча, які навучаецца на факультэце «Інфармацыйныя тэхналогіі».

«А 12-й мяне выклікалі ў дэканат. У кабінеце ў той момант знаходзіліся два невядомыя мне чалавекі. Праз нейкі час дэкан выйшаў, пакінуўшы мяне з імі. Яны сказалі, што з КДБ, але не прадставіліся. Цікавіліся маімі паездкамі ў Польшчу, Украіну. Пыталіся, ці ўваходжу я ў якіясьці апазіцыйныя арганізацыі.

Пасля яны зайшлі на маю старонку на сайце vkontakte.ru. Паказалі, што ў маіх сябрах знаходзяцца апазіцыянеры, як Павел Батуеў [лідэр апазіцыі ў Салігорску — Рэд.], некаторыя іншыя», — кажа П.Ляшковіч.

Потым хлопцу прапанавалі напісаць заяву аб супрацоўніцтве.

«Перад мной паставілі выбар: альбо працую на іх, альбо «такія дурні нашаму ўніверсітэту не трэба». Нават далі мне мянушку «Арцём». Абяцалі дапамагаць матэрыяльна», — кажа студэнт.

Ляшковіч быў вымушаны падпісаць паперы. «Яшчэ мяне абавязалі ў панядзелак напісаць заяву на ўступленне ў «Малады фронт». Прычым, я спачатку павінен быў адаслаць яе аднаму з куратараў, а ўжо потым у саму арганізацыю», — гаворыць хлопец. Кадэбісты прасілі не разгалошваць змест гутаркі.

За шырмай абвешчанай «лібералізацыі» падобныя выпадкі адбываюцца па ўсёй краіне. На «прафілактычныя гутаркі» на мінулым тыдні выклікалі студэнта Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэту Алега Пронскага, у Салігорску — навучэнца эканамічнага тэхнікуму Іллю Кавалея.

Гэта толькі тыя выпадкі, калі пайшоў розгалас. На яго наважваюцца не ўсе — баяцца страціць месца вучобы. Хаця ў падобных сітуацыях ратуе акурат публічнасць. Паводле закону, супрацоўніцтва з спецслужбамі добраахвотнае, — падкрэсліваюць юрысты-праваабаронцы. — Акрамя таго, палююючы на палітычных актывістаў, супрацоўнікі спецслужбаў займаюцца неўласцівымі функцыямі: яны абслугоўваюць інтарэсы не дзяржавы, а палітычнай групоўкі, што трымае ўладу, — кажуць юрысты.

**Зміцер Панкавец**

# Першы подыюм

беларускай прыгажуні з ружжом.

Першы раз на п'едэстал этапаў Кубку свету па біятлоне паднялася 22-гадовая беларуска Дар'я Домрачава.

На пятым этапе сезону ў нямецкім Рупольдынгу наша біятланістка заняла трэцяе месца ў спрынце. Дарка без памылак прайшла два агнявыя рубяжы і на фінішы прайграла 14 секундаў немцы Магдалене Нойнер, якая заняла першае месца з адным промахам.

Сёлета Домрачава ўжо пяць разоў трапляла ў першую дзесятку, але да п'едэсталу чагосьці ўвесь час бракавала.

Асаблівы крыўдны інцыдэнт здарыўся з беларускай тыдзень таму ў Обергофе. Падчас масавага старту Даша прыехала першай на другую стральбу, але разгубілася, што трэба страляць не стоячы, а лежачы. У выніку з гонкі яе дыскваліфікавалі. Спартсменка ж не раскісла, а наадварот прыклала ўсе намаганні, каб рэабілітавацца.

Дар'я Домрачава нарадзілася ў Мінску, але доўгі час з бацькамі жыла ў Расіі, дзе і пачала займацца біятлонам. Калі прыйшоў час выбіраць між дзвюма зборнымі, то выбар быў адназначна зроблены на карысць гістарычнай радзімы.

Цяпер Домрачава лічыцца самай перспектыўнай спартоўкай зборнай Беларусі.

**ЗП**


PRESSBALL.BY

# Гуляка, выходзь да палякаў

Палякі Гродна праявілі салідарнасць са сваёй апальнай лідэркай.

У калідорах прэзідэнтуры вырашылі «зняць» польскае пытанне. Пасля выкліку ў Адміністрацыю прэзідэнта, што адбыўся 10 студзеня, Юзаф Лучнік, старшыня створанага ўладамі Саюзу палякаў, 15 студзеня даслаў запрашэнне для старшыні альтэрнатыўнага, непадкантрольнага Саюзу палякаў Анжалікі Борыс, каб тая прыйшла на паседжанне Галоўнае Рады афіцыйнага Саюзу на перамовы.

Запрашэнне было напісана на польскай мове, на афіцыйным бланку СПБ, але з памылкамі.

Борыс прыйшла. Ды не адна. А разам з дзвюма сотнямі прыхільнікаў Саюзу. Сустрэў іх спецназ, КДБ і камеры дзяржаўных тэлеканалаў...

Выйшаў да людзей Лучнік і, збіты з панталыку, пачаў гаварыць парасійску... Яго высвісталі. Потым людзі патрабавалі, каб да іх выйшаў Леанід Гуляка, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Савету Міністраў, які таксама знаходзіўся ў Польскім доме.

— Гуляка, выходи к полякам, — скандавалі людзі.

Той не адважыўся выйсці.

Так і прайшло паседжанне Рады афіцыйнага Саюзу палякаў — ізноў без апанентаў.

**МБ; паводле poczobut.livejournal.com**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Замест аграгарадкоў — кібуцы

**Аграгарадкі сябе не апраўдваюць. Бо іх жыхары — калгаснікі — не маюць матывацыі да працы.**

Улады таксама хочуць выйсці з гэтага тупіка, калі прыняць усур'ёз заяву аб лібералізацыі эканомікі і абвяшчэнне 2009 году годам роднай зямлі, дзе прадугледжваецца нават адраджэнне хутароў.

Зразумела, хутары могуць быць адроджаныя толькі як турыстычныя аб'екты, бо ў дробных гаспадарках немагчыма прымяніць у поўным аб'ёме сучасную тэхніку і тэхналогіі. А насамрэч адрадзіць сяло можна праз перабудову аграгарадкоў у аб'яднанні на ўзор ізраільскіх кібуцаў.

Для гэтага трэба, каб сяляне сталі гаспадарамі і сапраўднымі ўласнікамі зямлі і прадукцыі. Трэба аддаць зямлю тым, хто яе апрацоўвае, а таксама нашчадкам былых гаспадароў.

З такім вырашэннем праблемы сяла будзе адначасова вырашацца і праблема беспрацоўя ў час крызісу ў гарадах.

**Мікалай Куксо, Івянец (Валожынскі раён)**

## Плітка новая, назвы старыя

**У Старых Дарогах пакрыліся асфальтам вуліцы, выбудаваныя новыя дамы, абнавіўся парк.** А вось большасць вуліцаў так і застаюцца, як у 1920—1940-я мінулага стагоддзя былі названыя бальшавіцкімі ўладамі: Маркса, Энгельса, Пралетарская, Камсамольская, Камуністычная... Прыкрыя назвы.

**Міхась Кутнявецкі, Старыя Дарогі**

## Любай дзяўчыне

Размаўляй са мной па-беларуску.
Калі хочаш, проста памаўчы.
Я хачу з тваіх салодкіх вуснаў
Паспытаць прастору далячынь.
Гавары са мной па-беларуску.

**Васіль Гардзіёнак, Віцебск**

## «Ні паеш, ні спяеш, ні паспіш»

Заўвагі пра мову аднаго верша.

**Даўно зацікавіўся паэтычнай творчасцю Віктара Жыбуля.** Таму для мяне не была нечаканай атэстацыя, якую дала паэту «НН» (18.12.2008), друкуючы яго верш «Доктар Алкаголь»: «Віктар Жыбуль адзін з найлепшых паэтаў пакалення 30-гадовых».

У гэтым дасціпным творы, на жаль, сустрэўся радок, пра які (як бы не хацелася) мушу сказаць.

Да доктара Алкаголя, які «ўсім здымае боль», прыйшла з сваёй бядою Марынка — прызналася, што ёй у паштовую скрынку нехта ўкінуў жывую мыш. А з гэтай прычыны «Ні паеш, ні спяеш, ні паспіш».

Згаданы кароткі радок мае дзве вялікія хібы.

Ні паеш — чысты русізм. Ён расчытваецца так: не пад'ясі (з'ясі) або не магу пад'есці (есці), ні пад'есці...

І яшчэ. Як бачым, у сказе адмаўляецца магчымасць ажыццяўлення дзеянняў, абазначаных дзеясловамі паесці (пад'есці), спяяць, паспаць. Значыць, пры гэтых дзеясловах у форме другой асобы адзіночнага ліку абвеснага ладу павінна быць адмоўная часціца не: не пад'ясі, не спяеш, не паспіш.

Прыкрыя недагляды...

Паказ канкрэтных адхіленняў ад літаратурных нормаў беларускай мовы падпарадкаваны дасягненню галоўнай мэты: каб увогуле такія «мышы» ў газетных і часопісных тэкстах як мага радзей траплялі ў паштовыя скрынкі чытачоў.

**Алесь Каўрус, Мінск**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Знакамітая знадворная экспазіцыя сталічнага музею вайны спыняе сваё існаванне. З пляцоўкі пры музеі вывезлі гарматы. На месцы будынку маюць збудаваць хмарачос гатэлю «Кемпінскі». А музей маюць размясціць каля помніка Гораду-герою («Стэлы») на пр.Пераможцаў.**

## Купала на сырах

**17 верасня 2007 году Лукашэнка наведаў сваю малую радзіму — вёску Александрыю і пасёлак Копысь.** У гэты дзень было адкрыццё мясцовага цэху па вырабе сыроў. Прысутныя спыталіся ў прэзідэнта, як называць сыры. Адказ: называйце, як хочаце, толькі «Лукашэнкаўскім» не называйце. А потым гісторык паводле адукацыі сказаў — называйце «Купалаўскі» (недалёка Ляўкі) і «Паўлаўскі» — мэр Мінску спансаваў будаўніцтва.

У снежні 2007 была распрацаваная рэцэптура і тэхналогія сыру «Купалаўскі» з помнікам Янку Купалу на этыкетцы.

Дык вось, я супраць такога. Не будзе ні вас, ні мяне, ні прэзідэнта, а Янка Купала быў, ёсць і будзе Апосталам Беларускай культуры. І хіба справядліва імя апостала на сыр ставіць?

Давайце яшчэ вырабім тушонку «Быкаўскую» з выявай Васіля Быкава, шакалад «Чорны квадрат Малевіча», гарэлку «Шагалаўскія палёты над Віцебскам»...

**Мікалай Рыбакоў, Копысь (Аршанскі раён)**

Давайце яшчэ тушонку «Быкаўскую» з выявай Васіля Быкава вырабім.

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Зварот грамадскага аргкамітэту святкавання 1000-годдзя назвы Літва

2009 год значны вялікай гістарычнай датаю — 1000-годдзем першай згадкі ў пісьмовых крыніцах наймення Літва (у лацінскім запісе Litua).

Яе фіксацыя ў нямецкіх Кведлінбургскіх аналах паўстала з трагічнай нагоды забойства вядомага прапаведніка, магдэбургскага каноніка і місійнага біскупа, святога апостала — Бруна з Кверфурта (каля 970 — 14.02.1009). Ён прагнуў хрысціянізаваць люцічаў і печанегаў, быў у Польшчы, Венгрыі, Кіеўскай Русі. Спроба пашырыць хрысціянства сярод прусаў і яцвягаў скончылася забойствам паганцамі святога Бруна і яго 18 спадарожнікаў. Загінулі яны на мяжы Літвы і Русі 14 лютага 1009 г. Пасля апостал Бруна быў абвешчаны святым, і яго ўспамін адзначаецца 15 верасня.

У нашай краіне створаны грамадскі арганізацыйны камітэт святкавання 1000-годдзя назвы Літва «Міленіум Літвы», у які ўвайшлі доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Грыцкевіч (старшыня), пісьменніца Вольга Іпатава, доктар гістарычных навук Алесь Краўцэвіч, доктар медыцынскіх навук Алесь Астроўскі, доктар біялагічных навук Аляксей Мікуліч, гісторык-археолаг Эдвард Зайкоўскі, старшыня міжнароднага аб'яднання беларусаў свету «Бацькаўшчына», мастак Аляксей Марачкін, краязнавец і святар Леанід Акаловіч, краязнавец і даследчык Здзіслаў Сіцька, мастак Мікола Купава (намеснік) і іншыя.

Аргкамітэт «Міленіум Літвы», зыходзячы з даследаванняў, якія сцвярджаюць, што найменне Літва адносіцца да старажытнай тэрыторыі Беларусі, прыкладае намаганні для далейшага вывучэньня гісторыі Літвы. Сённяшнія беларусы аж да пачатку XX стагоддзя называлі сябе ліцвінамі. Тэрміны Беларусь і беларусы навязаныя нам расійскай адміністрацыяй у сярэдзіне XIX стагоддзя. Беларусь з'яўляецца галоўнай пераемніцай Вялікага Княства Літоўскага. Нашыя землі ў ВКЛ складалі яго большую, асноўную частку. Менавіта на нашых землях і паўстала вялікая дзяржава ВКЛ, аб'яднаўшы ў XV стагоддзі ранейшыя асобныя княствы-землі: Навагрудскае, Полацкае, Смаленскае, Турава-Пінскае, Гарадзенскае і інш.

У этнагенезе ліцвінаў-беларусаў удзельнічалі славянскія і балцкія плямёны: полацкія, пскоўскія, смаленскія крывічы, радзімічы, севяране, дрыгавічы, частка палескіх валынянаў, падляскія яцвягі, асобныя групы прусаў-мігрантаў з Прусіі, дайнава і племя літва. Урэшце з племенных назваў перамагла назва Літва, даўшы сваё імя аб'яднанай і цэнтралізаванай дзяржаве — Вялікаму Княству Літоўскаму, дзе ліцвіны-беларусы тэрытарыяльна і колькасна складалі большасць, наша культура і мова былі даміноўнымі ў адміністрацыі і войску Вялікага Княства, да таго ж старабеларуская мова мела статус дзяржаўнай. На ёй былі напісаныя шматлікія літоўскія летапісы, усе Літоўскія Статуты (канстытуцыі) 1528, 1566 і 1588 гг., на ёй вялося справаводства ў канцылярыі ВКЛ — Літоўская Метрыка, каралеўскія, вялікакняскія, адміністрацыйныя, судовыя і прыватныя акты. На беларускай мове XVI ст. вялося справаводства ў паветах і гарадах, у тым ліку на абшары Жамойці (аж да Балтыйскага мора).

Менавіта ў першай сталіцы ВКЛ — Навагрудку, у 1253 г., каранаваўся на караля наш першы кароль Міндоўг. Назвы вёсак і мястэчак: Літва, Ліцвіны, Літоўка, Літавец, Літоўшчына, Ліцвінкі, Ліцвінчычы, Ліцвінаўка ды інш. рассеяныя па ўсім абшары сённяшняй Беларусі і там, куды калісьці даходзілі межы ВКЛ. Нярэдкімі з'яўляюцца і беларускія прозвішчы з коранем «літ»: Літвін, Ліцвіновіч, Ліцвінка і іншыя.

Аргкамітэт падрыхтоўкі святкавання «Міленум Літвы» распрацоўвае шэраг мерапрыемстваў, якія пройдуць па Літве-Беларусі ў 2009 годзе. Гэта разнастайныя публікацыі і выданні, міжнародная навуковая канферэнцыя, нацыянальная мастацкая выстава, конкурс дзіцячага малюнку, музычныя канцэрты.

Аргкамітэт запрашае навукоўцаў, творчыя калектывы і асобных творцаў узяць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы «Міленіуму» і яго правядзенні. Запрашаем творцаў да напісання музычных, мастацкіх, літаратурных твораў; вытворцаў і прамыслоўцаў — да стварэння новых вырабаў, якія маглі б насіць наша гістарычнае імя. Прыгадайма славутую гісторыю Берасця-Літоўскага, Менска-Літоўскага, Высокага-Літоўскага і іншых паселішчаў, якія гэтае імя насілі, а таксама і тыя, якія да сёння называюцца: Літва, Літоўка, Ліцвяны і г.д. У гэтых мясцовасцях павінны адбыцца рэгіянальныя ўрачыстасці. Запрашаем да агульна-нацыянальнай асветніцкай і культуралагічнай акцыі. Пра творы, здабыткі і прапановы просім паведамляць на адрас Аргкамітэту:

**п/с 26 220050 г.Мінск, e-mail: lacinski@interia.pl**
**тэл. (029) 306 33 17 / (029) 551 32 36 / (029) 352 60 10**

### З ГІСТОРЫІ ГАЗЕТЫ

## «Наша Ніва» жартуе, смяецца...

**«Наша Ніва» пачала смяяцца толькі напрыканцы трэцяга году свайго жыцця, з №49 за 1909 год.** А дагэтуль у «Нашай Ніве» гумару не было. Не было ў рэдакцыі чалавека, які б заняўся гэтым. І ім стаўся Ядвігін Ш., самы заўзяты і неўтаймоўны гумарыст. Шмат з таго, што колісь падслухаў і надрукаваў у «НН» Ядвігін Ш., увайшло ў залаты фонд нашага гумару. Вельмі часта, скажам, сённяшнія нашы газеты друкуюць такую смяшынку:

— Чаго плачаш, Янук?

— Капейку згубіў.

— На табе дзве, толькі не плач.

Янук узяў дзве капейкі, схаваў іх і ізноў плача:

— Дык чаго ж плачаш?

— Як жа мне не плакаць? Як бы не згубіў гэнай капейкі, дык меў бы ўжо тры.

Пасля Ядвігін Ш. збярэ пачутае ім і выдасць у 1915 годзе асобнай кніжачкай «Беларускія жарты». У ёй з'явяцца і першыя беларускія жарты на літаратурныя тэмы:

— А паненцы хто больш даспадобы: пісар Янка Купала ці Якуб Колас?

— А мне што да іх за наўда! Я маю свайго кавалера: пісара ў воласці!

«Дазволен ваеннай цэнзурай», — значыцца на адваротным баку вокладкі кнігі Ядвігіна Ш.

Нашаніўская пара — гэта была пара народзінаў палітычнага і моўнага беларускага гумару. А гэта натуральна: адбывалася нараджэнне нацыі. І гэтая з'ява знаходзіла свой адбітак у гумары.

**Уладзімір Содаль, Мінск**

# БАЖ абвяшчае конкурс для дзяцей «Помнікі роднага краю»

Да ўвагі выхаванцаў школ маладога журналіста, школ мастацтваў, агульнаадукацыйных школ, выхаванцаў краязнаўчых і мастацкіх гурткоў.

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» сумесна з ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» абвяшчае дзіцячы конкурс «Помнікі роднага краю».

Мэта конкурсу — прыцягнуць увагу маладых грамадзян Беларусі да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй «малой радзімы». Запрашаем да ўдзелу дзяцей ва ўзросце ад 5 да 16 гадоў.

На конкурс прымаюцца журналісцкія матэрыялы, краязнаўчыя працы, эсэ, малюнкі, якія прысвечаныя архітэктурным і гісторыка-культурным помнікам Беларусі. Вітаюцца працы пра малавядомыя гістарычныя мясціны нашай краіны, пра забытыя і закінутыя помнікі.

**Працы на конкурс прымаюцца да 1 сакавіка 2009 году.**

Усе конкурсныя працы павінны быць падпісаныя. На зваротным баку малюнкаў павінны быць напісаныя імя і прозвішча ўдзельніка конкурсу, яго ўзрост, хатні адрас і тэлефон. Імя і прозвішча ўдзельніка, узрост, хатні адрас і тэлефон павінны быць пазначаныя таксама пад кожным артыкулам ці эсэ, дасланым на конкурс.

Мова конкурсных прац — расійская і беларуская. Аб'ём працы — не больш за 4 друкаваныя старонкі 12-ым кеглем.

Пераможцы конкурсу будуць ушанаваныя. Найлепшыя працы і малюнкі ўвойдуць у друкаваную кнігу «Мая Беларусь».

**Свае працы трэба дасылаць на адрас:** 220030, г. Мінск, пл. Свабоды, 17-304 з пазнакай «на конкурс «Помнікі роднага краю».

15 студзеня ў Мінску ў межах антыалкагольнай акцыі сталічнай міліцыі «Калі піць — у сям'і не жыць» адбылася першая сёлета адпраўка ў ЛПП у Навагрудак 35 хранічных алкаголікаў, жыхароў сталіцы. Мерапрыемства прайшло пры ўдзеле аркестру ГУУС на тэрыторыі цэнтру ізаляцыі правапарушальнікаў.

Тым, каго адпраўлялі ў лячэбна-працоўны прафілакторый, раздалі кефір.

Пагрузка ў аўтобус праходзіла пад кампазіцыю з кінакамедыі Леаніда Гайдая «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка» і марш «Развітанне славянкі». Усе адпраўленыя ў ЛПП — мужчыны. Праз некалькі гадзін тут жа пройдзе адпраўка ў прафілакторый 10 жанчын-алкагалічак.

Адпраўка ў ЛПП не лічыцца судзімасцю, хаця рашэнне аб гэтым прымае суд, які прызначае тэрмін знаходжання ў прафілакторыі — ад 1 да 1,5 году.

**Вячаслаў Будкевіч, БелаПАН**



# У ЛПП з аркестрам

Фотарэпартаж **Юліі Дарашкевіч**.





Алкагалізм — гэта хвароба. Яна характарызуецца моцнай псіхічнай залежнасцю. Лячыць яе трэба, але ці дае эфект прымусовае лячэнне? Нярэдканазіраецца, што ЛПП, наадварот, уцягвае п'яніц у пэўнае асяроддзе.

ЛПП з краінаў былога СССР захаваліся толькі ў Беларусі і Туркменістане. Шоу з аркестрам, у разліку на медыйны эфект, гэта ўвогуле прыём, прыдуманы ў Беларусі.





# Паліцаі пакараныя. А партызаны?

**Я, былы жыхар вёскі Дражна Старадарожскага раёну, былы непаўналетні вязень фашысцкага канцлагеру, пенсіянер–інвалід, усё жыццё дамагаўся таго, каб была расказаная праўда пра спаленне партызанамі нашай вёскі ў красавіку 1943 году.**



Юлія Дарашкевіч

Дзякуючы краязнаўцу і журналісту Віктару Хурсіку некалькі гадоў таму ўбачыла свет кніга «Кроў і попел Дражна», у якой выкладзеныя абставіны трагедыі. Я меркаваў, што дакументаў кнігі будзе дастаткова, каб узбудзіць крымінальную справу па факце забойства партызанамі 25 мірных жыхароў. Аднак пракуратура адказала мне адпіскамі. Я звяртаўся з просьбай да кіраўніка краіны, чакаў, што ён адкажа на мае лісты, выбачыцца за дзеянні партызан, але лісты да яго так і не дайшлі. Я па-ранейшаму не магу прыцягнуць да адказу тых, хто на маіх вачох зарэзаў маці, застрэліў сястру-камсамолку і брата.

Акрамя таго апошнім часам у газеце «Советская Белоруссия» з'яўляліся артыкулы, якія апраўдваюць злачынцаў. Я звяртаўся ў рэдакцыю, але мае пярэчанні ніхто і слухаць не стаў. Хіба можа такое быць у цывілізаванай краіне? Замест справядлівай кары ў адносінах да забойцаў, у дзяржаўнай прэсе пачалося цкаванне смелага, прыстойнага журналіста. Як вынік — у красавіку мінулага году Віктара Хурсіка кінулі за краты. Але пісакі не супакоіліся, яны спрабуюць навесіць на аўтара апраўданне дзеянняў паліцэйскіх, у той час, як ён звярнуў увагу грамадскасці выключна на партызанскае злачынства. У публікацыі ў «СБ» ад 5 снежня 2008 г. пад назвай «Попел і алмаз» нехта А.Каўрэй, партызан 100-й брыгады імя Кірава, якая сапраўды існавала ў раёне Старых Дарог, спрабуе апраўдаць партызан-забойцаў. Ён піша, што «ў паліцэйскім гарнізоне не было мірных жыхароў». Дык кім жа тады быў я і іншыя падлеткі, мая мама, сястра, брат? Засталіся жывыя і іншыя сведкі — сваякі тых, каго партызаны забілі альбо спалілі жыўцом у сваіх дамах?

Такі цынізм з вуснаў партызана 100-й брыгады, у якой ваяваў і загінуў мой бацька, абурае да глыбіні душы. Некаторы час у гэтай брыгадзе быў і я. Да моманту сваёй гібелі бацька і кіраўніцтва брыгады спрабавалі пераправіць мяне і брата на Вялікую зямлю. Але пасля гібелі бацькі гэтыя спробы спыніліся, мы — дзеці — яшчэ пабылі сярод партызан (нікому не патрэбныя) і былі вымушаныя вярнуцца ў родную вёску, дзе месціўся паліцэйскі гарнізон. І ўжо іншыя партызаны — 5-га габрэйскага партызанскага атраду імя Кутузава 2-й Мінскай партызанскай брыгады — неўзабаве забілі на маіх вачох родных і вяскоўцаў.

Усяляк уводзячы ўвагу чытачоў газеты ад гэтага злачынства, А.Каўрэй спрабуе падаць чытачам мяне і аўтара кнігі В.Хурсіка як яры х пабарнікаў нямецкага «новага парадку». Гэта трызненне! Пасля таго, як партызаны забілі маіх сваякоў, немцы хутка адправілі мяне ў канцлагер. Я ледзь выжыў там. Паліцэйскія, як вядома, пасля вайны панеслі заслужанае пакаранне. А вось партызан-злачынцаў гэткі лёс не напаткаў.

Аўтар згаданага артыкулу ў сваім апраўданні праліцця нявіннай крыві дзяцей і жанчын даходзіць да абсурду. Ён піша: «І калі нас і нашыя сем'і бязлітасна забівалі паліцаі, то што мы павінны былі рабіць? Раскурваць з імі цыгаркі?» Так, з сем'ямі паліцэйскіх вы не раскурвалі цыгарак. Безабаронных дзяцей і жанчын вы расстрэльвалі ў першую чаргу, рапартуючы аб праведзеных баявых аперацыях па разгроме ворага. Толькі згадваць пра гэта не жадаеце. «Гераічна» спалілі будынак школы ў Дражна ў 1944-м, калі ад паліцэйскіх і немцаў у вёсцы і дух прастыў. Не падумалі, дзе будуць вучыцца дзеці, абы скуру ўратаваць, каб не спыталі: чым займаўся ў тыле.

Абслугоўваючы ідэалогію разбою, вы нават не паруліліся знайсці аргументы для сваіх сцверджанняў. Узяць размову пра помнік. Пра той, які стаіць у вёсцы Дражна і на якім напісана, што ён пастаўлены ў гонар чырвонаармейцаў. Вы сцвярджаеце, што нейкі бэнээфавец хацеў бы на яго месцы бачыць помнік паліцэйскім. Жывучы ў вёсцы Дражна, я не бачыў чырвонаармейцаў ні ў 1941, ні ў 1944. Баі тады абышлі гэтую мясціну бокам. У магіле на ўскраіне Дражна спачываюць тыя партызаны, якіх бяздарныя камандзіры кінулі пад паліцэйскія кулямёты ў красавіку 1943. Разлзаваны няўдачай штурму паліцэйскіх дзотаў камбрыг Іваноў даў загад спаліць вёску. Пасля таго, як асеў попел пажарышчаў і паліцэйскія выйшлі з сваіх некранутых дзотаў, яны прымусілі сяльчан хаваць трупы партызан. Пасля вайны казаць пра гэта ўлады забаранялі, каб не ўзбудзіць цікавасці да трагедыі. Сёння імёны гэтых партызанаў вядомыя, і было б па-чалавечы правільна выбіць на граніце іх імёны. Пра гэта і кажа Хурсік. Але ідэолагі не жадаюць гэтага. Вось і выдумалі няіснага бэнээфаўца. Падобна, ім патрэбны цень, каб з ім змагацца і апраўдваць велізарныя сродкі, якія марнуюцца на ўтрыманне ідэалагічнага апарату. Я пражыў усё свядомае жыццё ў СССР, у роднай Беларусі. За доўгія гады жыцця бачыў розную прапаганду, але такой «дзяшоўкі», як цяпер, не было ніколі. Людзі ў сваім развіцці даўно пайшлі наперад, а ім спрабуюць павесіць «лапшу» сярэднявечнымі метадамі. Каму гэта трэба?

> **Я па–ранейшаму не магу прыцягнуць да адказу тых, хто на маіх вачох зарэзаў маці, застрэліў сястру–камсамолку і брата.**

Хацеў бы звярнуцца да партызана: перачытайце, таварыш Каўрэй, свой артыкул. Спярша вы кажаце, што пісалі яго, дазнаўшыся пра трагедыю нашай вёскі з газеты «Камсамольская праўда». Але артыкул той быў надрукаваны больш за год таму! А рубрыка вашага матэрыялу ў «Савецкай Беларусі» называецца «Не магу маўчаць». Нешта вельмі доўга хадзілі цяжарным, надта доўга ў вас не раскрываўся рот.

Баліць сэрца, калі чытаеш вашую прапанову ўбіць кол на месцы магілы маёй маці і іншых бязвінных ахвяраў дражненскай трагедыі, «каб гэтыя нягоднікі ніколі не ўваскрэслі». Як пасля гэтага чытаць газету? Ад вас і «СБ» патыхае акупацыяй беларускага духу. Свой «матэрыял» у ёй вы скончылі словамі: «Далоў акупантаў і іх прыспешнікаў! Слава героям-антыфашыстам!» Я цалкам далучаюся да гэтых слоў, якія актуальна гучаць у сучаснай Беларусі.

**Мікалай Пятроўскі, былы жыхар вёскі Дражна, відавочца спалення вёскі партызанамі ў красавіку 1943 году**

**Ад Рэдакцыі.** Публікацыі «НН» з гісторыі вайны апошнім часам кранаюць найперш тэмы, што застаюцца закрытымі для падручнікаў і несвабодных СМІ.

У той вайне Беларусь аказалася між молатам злачыннага нацызму і кавадлам варварскага сталінізму. Дагэтуль беларусы глядзяць на падзеі вайны вачыма Расіі, СССР. А не з пазіцыі нацыянальных інтарэсаў Беларусі.

Трагедыя вёскі Дражна, што недалёка ад Мінска, дагэтуль замоўчваецца афіцыйнымі гісторыкамі. Нават крыж, пастаўлены там, вырвалі. Таму што дражненскія сведчанні выкрываюць тое, што было тайнай за сямю пячаткамі пры саветах.

Па-першае, у Беларусі вайна была братазабойчай, бо частка нашых суайчыннікаў, ненавідзячы сталінскіх крывапійцаў, паверыла ў тое, што немцы — меншае зло. Як жа яны памыляліся.

І другое. Кіраваная з Масквы партызанка (як і партызанкі, кіраваныя з Лондана ці Берліна) найперш мелі на мэце справакаваць як мага болей шкоды для тылу ворага. Разбурэнні, ахвяры сярод мірнага насельніцтва не лічыліся. Таму ў адных раёнах краіны партызаны былі паратункам для людзей, а ў другіх, наадварот, удзень селянін баяўся немца, а ўначы — троссся перад партызанамі розных гатункаў. Беларусь была тады разменнай манетай для імперый.

Таму так каштоўныя ўспаміны відавочцаў вайны, беларуская гісторыя якой яшчэ не дапісаная.



Злева направа: Эрык Картмэн, Кайл Брафлоўскі, Стэн Марш, Кені.

# Яны забівалі Кені

**Розніца паміж Саўс Паркам і Барысавам не такая ўжо вялікая. «Саўс Парк» — гэта серыял нібы пра нашу радзіму вечназялёных памідораў. Піша Павал Касцюкевіч.**

### Саўс Парк і ўсе-ўсе-ўсе

Папулярны серыял «Саўс Парк» вось ужо 11 гадоў ідзе па канале Comedy Central, робячыся толькі папулярнейшым. У чым сакрэт?

Перапеўкі ўсяе галівудскае класікі: ад «Маўчання ягнятаў» да «Уладара Пярсцёнкаў». Няўтомныя пароды на поп-культуру, неўміручы клазетны гумар, сатырычнае асвятленне сусветных навінаў — вайна ў Іраку, тэракт у вежах-блізнюках. Ужо не кажучы пра сучасную палітыку: Буш, Кандаліза Райс, Уладзімір Пуцін камічна прадстаўленыя ў «Саўс Парку». Дадамо талкова закручаны сюжэт — і атрымаем самы папулярны серыял у гісторыі тэлебачання.

Амерыканская глухмень. Мястэчка знаходзіцца на мяжы са стылай Канадай і таму, нягледзячы на шматабяцальную назву («Паўднёвы парк»), там пануе бестэрміновая зіма. Не дзіва, што галоўныя героі, чатыры 8-гадовыя хлопчыкі, не вылазяць з куртак-аляскак і аблавушак.

Вось Кені. Ён нібы ўпаяны ў сваю куртку з капюшонам. Адны вочы відаць. Амаль кожную серыю нехта з персанажаў серыялу забівае гэтага бедака, але ў наступнай частцы ён уваскрасае. З абрыўкаў непрыстойнасцяў, што вылятаюць з-пад ягонага капюшона, можна зразумець, што ён у свае малыя гады вельмі-вельмі любіць дарослых жанчын.

Яго сябар, Эрык Картмэн, пульхны хлопчык, які мае яўна расісцкія схільнасці, на карнавалах пераапранаецца ў фюрэра, а яго мама — маці-адзіночка, якая зарабляе на пражытак, здымаючыся ў порнастужках.

Трансэксуал, настаўнік малодшых класаў, спадар Гарысан, што пакутуе на падваенне асобы, безупынку мяняе свой пол.

Ісус Хрыстос — таксама сталы жыхар Саўс Парку. З аднаго боку, ён усёмагутны Сын Божы, з іншага — нудны тэлевізійны псіхолаг, які вядзе нядзельнае шоу на мясцовым тэлебачанні.

Калі-нікалі ў мястэчка завітваюць арханёл Гаўрыіл, таксікаман-лайт, які ўпадабаў нюхаць каўпачкі ад фламастэраў, а таксама Садам Хусэйн, які пасля ўзнясення на неба працягвае будаваць свае ядзерныя заводы, ашукваючы цяпер не сусветную грамадскасць, а самога Госпада Бога. Між іншага, былы дыктатар раз-пораз спакушае Шатана, сарамяжлівага латэнтнага гомасексуала.

І яшчэ ў Саўс Парку жыве некалькі сотняў персанажаў-фрыкаў са сваімі, велічынёй з далонь, тараканамі ў галаве.

Саўспаркаўцы лятуць на Месяц, змагаюцца з абортамі, шукаюць тэрарыстаў, едуць разам з Санта-Клаусам (аматарам пастраляць з вінчэстэра) святкаваць Каляды ў разбомбленым Багдадзе. То бок, паводле ўсіх прыкметаў, Саўс Парк, мястэчка і серыял, — тыповы дурдом.

### «Сімпсаны» гэта ўжо рабілі

Стваральнікі серыялу, Мэт Стоўн і Трэй Паркер, безумоўна, геніяльныя хлопцы, але ж яны не першыя. Ад саладжавых шоу і сямейных прылізаных камедыяў 1980-х дарогу «Саўс Парку» расцерабіў мультсерыял «Сімпсаны».

Звычайная амерыканская сям'я: бацька — здзяцінелы сацыяпат, сынок — хранічны абібок, а горадам кіруюць скарумпаваныя жмінды-капіталісты і ненавіснікі людскога роду.

У «Сімпсанах» упершыню выпячваліся, а не хаваліся сярэднестатыстычныя фобіі амерыканцаў (патаўсцець, страціць працу, не здолець сплаціць крэдыт за кватэру), нацыянальныя псіхозы (пагоня за зніжкамі, шопінг).

**«Саўс Парк» не пратэст, а карнавал, адна гадзіна ў тэлепраграме, калі ўсе дагары нагамі, калі ніз робіцца верхам.**

Такой непрыхаванай праўды ў серыялах Амерыка пра сябе яшчэ не бачыла, і... «Сімпсаны» зрабіліся страшэнна папулярнымі. Героі — дарма што серыяльныя — паказаныя ўсебакова, жыццёва, а перад імі стаяць зусім негалівудныя дылемы (аборт або раджаць, кульнуць — ці не піць).

Гледачы палюбілі бязладную сямейку не за тое, што яна супер, а якраз за тое, што яна не супер. Вынаходка, анімацыйнае шоу, тое, што раней называлася не дужа папулярным тэрмінам «мультфільм для дарослых». Маляваныя персанажы служылі як бы амартызатарам ад культурных шокаў — маўляў, «гэта ж мульцік, не папраўдзе, несур'ёзна» — і рабілі сваю чорную справу. У дадатак «Сімпсаны» падрыхтавалі гледача для такіх народных, але дасціпных ідэямі і жартамі серыялаў пра далёка не ідэальных, але мілых людзей, як «Сябры/Friends», «Секс у вялікім горадзе» і, пэўна, да навамоднага «Доктара Хауса», серыяла пра лекара-мізантропа.

Стваральнікі «Саўс Парку» напоўніцу скарысталіся з выдзяўбанай «Сімпсанамі» нішы, зрабіўшы свае жарты яшчэ вастрэйшымі, а іронію — знішчальнейшай.

На знак павагі Мэт Стоун і Трэй Паркер выштукавалі серыю «Саўс Парку», дзе іх маляваныя персанажы былі зробленыя на «сімпсанаўскі» манер і назвалі яе Simpsons did it! («Сымпсаны гэта ўжо рабілі!»).

### Непаліткашэрна

А яшчэ «Саўс Парк» — зацятае патуранне стэрэатыпам. Або змаганне з імі — каму як падабаецца. Каталікі, мармоны, габрэі, лацінаамерыканцы — ці не ўсе сектары амерыканскага грамадства становяцца мішэнямі непаліткарэктных кепікаў. Тое, што ў амерыканскім грамадстве толькі абмяркоўваецца, у «Саўс Парку» даводзіцца, як на думку стваральнікаў, да лагічнага завяршэння.

Суперскандал з амерыканскімі ксяндзамі, якія разбэшчвалі малых хлопчыкаў? У «Саўс Парку» факт звабы хлопчыкаў прымаецца як дадзенае, што не выклікае сумневаў, ад чаго і будуецца сюжэт (серыя пра з'езд ксяндзоў-педафілаў).

Нават з'яўленне ў серыяле новага героя, Каляднай Гаўняшкі, зроблена не для таго, каб у тысячны раз паўтарыць нейкі пляскаты клазетны жарт, а дзеля таго, каб выкрыць крывадушную саладжавасць шматлікіх галівудскіх кінастужак пра Раство.

Мэт Стоун і Трэй Паркер зарэзалі столькі святарных кароваў, што яны дагэтуль жывыя і здаровыя.

### Гэта вам (не) Рыо-дэ-Жанейра

Ваяўнічы нігілізм серыялу — гэта, хутчэй, не пратэст, а клапан для выпуску незадаволенасці, своеасаблівая прадуха.

Культуролаг Андрэй Расінскі перакананы, што стваральнікі «Саўс Парку» — не рэвалюцыянеры. «Саўс Парк» не пратэст, а карнавальнае дзейства, адзін дзень у годзе, адна гадзіна ў тэлепраграме, калі ўсе дагары нагамі, калі ніз робіцца верхам, верх — нізам, калі можна беспакарана падрываць жорсткую існуючую іерархію грамадства, у лоб атакаваць моцных», — сцвярджае Расінскі. — «Саўс Парк» — гэта тое, што філосаф Бахцін называў «нізавой смехавай культурай». У сусветнай культуры існуе вялікая традыцыя гратэску, што вядзецца з антычнасці, з часоў драмапісца Меніпа: у ягоных п'есах багі былі занятыя не вяршэннем лёсу смяротных, а ўласнымі камунальнымі праблемамі. У нашай традыцыйнай культуры гэтаму гратэскнаму кірунку ў мастацтве адпавядаюць паэмы «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат».

### Саўспаркаўшчына

Мы смяемся з «Саўс Парку», бо нас гэта чапляе. Бачачы амерыканцаў, мы пазнаем сябе. Заўважаем са здзіўленнем, што розніца паміж Саўс Паркам і, скажам, Барысавам не такая ўжо вялікая. У нас, вядома, пакуль шмат якія тэмы прыхаваныя, як то праблемы полавых меншыняў ці карумпаванасць чыноўнікаў. Гэтыя пытанні, у адрозненне ад Амерыкі, у нас публічна абмяркоўваць не заведзена. Але жарты пра тых самых гомасексуалаў нам ужо, прынамсі, зразумелыя.

Мы смяемся з саўспаркаўскай фразы «Ці ёсць у вас крышачку інтэрнэту?» (Сюжэт: у Амерыцы знікае інтэрнэт, і ўсе амерыканцы пагалоўна, каб атрымаць сваю дозу сеціва, накіроўваюцца ў адзін далёкі штат, дзе яно яшчэ ёсць.)

А яшчэ: як жа па-роднаму гучаць словы Эрыка Картмэна, нібыта ён кажа не пра свой Каларада, а пра нашу радзіму вечназялёных памідораў: «У нас толькі дзве паравіны году — зіма і ліпень».

Ці можна чакаць беларускі культурны прадукт, аналаг «Саўс Парку»? «Тараса на Парнасе» — неяк далекавата ў часе.

У беларускай культурнай сітуацыі ёсць свая спецыфіка. У краіне, дзе за год насілу здымаюцца дзве ўласныя (не на расійскую тэматыку і грошы) кінастужкі, няма сродкаў на серыялы. А калі яны раптоўна з'яўляюцца, дык, на думку культуролага Максіма Жбанкова, беларускія творцы не заўсёды валодаюць патрэбнымі для складаных культурных праектаў навыкамі. І, пэўна, таму, беларуская культура ратуецца нізкабюджэтнымі праектамі. Таму наш аналаг «Саўс Парку» — не мульцік.

Беларускія пабрацімцы «Саўс Парку» — гэта найперш пачылая ў Бозе гумарыстычная газета «Навінкі» (адзін з асколкаў якой, Лёлік Ушкін піша ў «НН» фельетоны, калі так можна сказаць, у «саўспаркаўскай» стылістыцы). Другі прыклад — шоу «Саша і Сірожа» на тэлеканале «Белсат». Штовечар на экране з'яўляюцца два дасканалыя калдыры — Саша і Сірожа (лідэр «Ляпісаў» Сяргей Міхалок і мастак Аляксандр Хацкевіч): і мовай жыхароў мінскіх прыгарадаў, на поўным сур'ёзе, абмяркоўваюць «всякія вапросы».

У адрозненне ад «Саўс Парку», «нармальныя пацаны» шмат чаго не дагаворваюць, не наважваючыся адкрытым тэкстам атакаваць дзейны парадак і моцных гэтага свету. У іх многа намёкаў, шматзначнасці, завуляяваных пад сарамяжлівую праставатасць. Не так як у «Саўс Парку»: цішком, па-партызанску, па-беларуску.

**5 не самых страшных цытатаў з «Саўс Парку»:**

**1. Эрык Картмэн, звяртаючыся да свайго сябра, Стэна Марша:** «Ты што, не ведаеш першага закону фізікі? Усё, што кайфовае, каштуе як найменей 8 даляраў».

**2. Стэн:** «Чаму Госпад дазваляе майму чэлесу рабіцца мулкім у тыя хвіліны, калі дзяўчаты не хочуць, каб ён быў унутры іх. Гэта ж нейкі бессардэчны жарт».

**3. Школьны кухар, былы хіпі, звяртаючыся да чацвёркі галоўных герояў:** «І барані вас Бог прымаць наркотыкі, дзеці! На гэта ж будзе свой час і месца. Яно называецца каледж».

**4. Кайл:** «Гэта напалову чалавек, напалову мядзведзясвіння».

**Картмэн:** «Не! Гэта напалову чалавек, напалову мядзведзь і напалову — свіння».

**Кайл:** «Гэтага не можа быць».

**Стэн:** «Добра, тады гэта напалову мядзведзь, і напалову — чалавекасвіння».

**5. Дзядзька Стэна, прататып «нармальнага пацана»:** «На паляванне і цвярозым? Паляваць цвярозым — гэта ўсё роўна як... як... як рыбу лавіць цвярозым!».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Кніга пра Адольфа Янушкевіча

**23 студзеня а 18-й у памяшканні Беларускага ПЭН-цэнтру (вул.Залатая горка, 2—101)** адбудзецца прэзэнтацыя кнігі «Жыццё Адольфа Янушкевіча і яго лісты з кіргізскіх стэпаў» з удзелам Ганны Матусэвіч, Адама Мальдзіса, Кастуся Цвіркі.

Цікавасць да малой гісторыі, краязнаўства расце ў грамадстве. Штогод часцей выходзяць кнігі, прысвечаныя гісторыі таго ці іншага гораду, мястэчка, вёскі, жыццю выбітных землякоў. За апошні год трапіла ў рукі некалькі такіх: ад рукапісных да шыкоўна выдадзеных за грошы сельскага савету... Кніга, падрыхтаваная спадарыняй Ганнай Матусэвіч, — з гэтага шэрагу, але мае адметнасці. Матусэвіч усё, ад пошуку першых выданняў і да арганізацыі выдання сучаснага, рабіла сама.

Адольф Янушкевіч — удзельнік паўстання 1831 году, пасля паразы высланы ў Сібір. Ён правёў там 25 гадоў і толькі пад самы канец жыцця вярнуўся дамоў, у вёску Дзягільна непадалёк ад Койданава. Усе гэтыя 25 гадоў паміж Адольфам і ягонай сям'ёй вялася актыўная перапіска. На аснове лістоў, па смерці Адольфа, ягоны сябар Фелікс Вратноўскі ўклаў кнігу «Жыццё Адольфа Янушкевіча і яго лісты з кіргізскіх стэпаў», выдадзеную ў 1861 г. у Парыжы, а затым перавыдадзеную ў 1875 г. ў Берліне. Спадарыня Ганна змагла адшукаць гэтыя выданні і перакласці кнігу на беларускую — або, як гаворыць яна сама, — «нашу, ліцьвінскую», мову.

Сталыя чытачы «НН», напэўна, памятаюць цыкл Ганны Матусэвіч «Дзярыюш», які друкаваўся ў 1996 годзе — узор таленавітай, чыстай і трывожнай літаратуры. Асноўная асаблівасць душы, жыцця гэтай неардынарнай жанчыны — няспынная праца. Яна сама выхоўвае і падымае


Адольф Янушкевіч.

траіх дзяцей; дачка Вераніка стала яе першай памочніцай і ў працы па вяртанні да чытачоў «Жыцця Адольфа Янушкевіча...», і ў пошуках яго магілы, і ў добраўпарадкаванні старых Панскіх могілак у Дзягільне.

Для Ганны выдадзеная ёю кніга — найперш «духоўны скарб», «кніга пра носьбіта высокага Духу, якім быў Адольф Янушкевіч».

Выразная карціна тагачаснага жыцця паўстае з старонак кнігі, і чытаць яе будзе цікава ўсім, хто цікавіцца гісторыяй, краязнаўствам, літаратурай.

Набыць кнігу, пачуць ад самой перакладчыцы гісторыю яе пошукаў і ўзнаўлення, пакантактаваць з перакладчыцай і задаць пытанні можна будзе на прэзэнтацыі.

**НБ**

**Жыццё Адольфа Янушкевіча і яго лісты з кіргізскіх стэпаў, I том \ пер. з польск., прадм. і камент. Г. Суднік-Матусэвіч.** — Мінск: Медзісонт, 2008. — 208 с., з іл. 100 ас.

## ВЫСТАВЫ

**Аляксандр Кішчанка**

**22 студзеня ў Мастацкім музеі** адкрыецца выстава «Пульс», на якой будуць паказаныя творы Аляксандра Кішчанкі. Выстава будзе працаваць **да 24 лютага.**

**Ігар Сечынаў**

**З 23 студзеня да 22 лютага ў «Свеце Фота» (Прытыцкага, 10)** працуе персанальная фотавыстава Ігара Сечынава.

**Родзін у «Падземцы»**

**23 студзеня а 18-й гадзіне ў галерэі «Падземка» (пр. Незалежнасці, 43)** адбудзецца прэзэнтацыя альбому рэпрадукцый мастака Алеся Родзіна.

**Златадзён**

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (Багдановіча, 15) з 30 студзеня да 28 лютага** адбудзецца выстава Андрэя Бурсава «Златадзён» (жывапіс, вершы).

## КАНЦЭРТЫ

**Вольскі: куплеты і прыпевы**

**24 студзеня ў «Добрых мыслях» (Магілёўская, 12)** — сольны праект Лявона Вольскага «Куплеты і прыпевы». **Пачатак а 19-й.**

**Партытуры магнацкага двору**

**29 студзеня ў Малой зале імя Рыгора Шырмы (пр.Незалежнасці, 50)** адбудзецца канцэрт «Партытуры магнацкага двору». Музыка «ганаровых ушанаванняў», музыка «палацавых падзей»… Якой яна была ў Беларусі? Пра гэта можна даведацца на канцэрце, праслухаўшы агучаныя рукапісы прыдворных бібліятэк, у выкананні ансамблю салістаў «Класік-Авангард» Белдзяржфілармоніі пад кіраўніцтвам Уладзіміра Байдава.

**2009-HARD-PARTY**

**30 студзеня ў клубе Night Star (Свярдлова, 2)** — фестываль альтэрнатыўнай музыкі 2009–HARD–PARTY

**Neuro Dubel**

**22 студзеня ў DAclub (Броўкі, 22)** — канцэрт Neuro Dubel. **Пачатак а 19-й.**

**Madera Hard Blues**

**22 студзеня ў «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — вечар блюзавай музыкі з удзелам Madera Hard Blues. **Пачатак а 19-й**

**Інтэрферэнцыя**

**25 студзеня ў Night Star (вул. Свярдлова, 2)** — фестываль некамерцыйнай музыкі «Інтэрферэнцыя». **Пачатак а 18-й**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатр**

**22 (чц), 23 (пт)** — «Ідылія»
**24 (сб)** — «Сымон-музыка»
**25 (ндз)** — «Макбет»
**26 (пн)** — «Я не пакіну цябе...»
**27 (аўт)** — «Больш чым дождж»
**28 (ср)** — «Вольга»
**29 (чц)** — «Памінальная малітва»
**30 (пт)** — «Слуга двух гаспадароў»
**31 (сб)** — «Вечар»
*ранішнія спектаклі*
**25 (ндз)** — «Афрыка»
*малая сцэна*
**24 (сб)** — «Дамскае танга»
**26 (пн)** — «Апельсінавае віно»
**30 (пт)** — «Варшаўская мелодыя»
**31 (сб)** — «Дзікае паляванне караля Стаха»

**Тэатр лялек**

**22 (чц)** — «Сіняя птушка»
**23 (пт)** — «Гісторыя аднаго гораду»
**24 (сб)** — «Чырвоны каптурок»
**25 (ндз)** — «Васіліса Прыўкрасная»
**29 (чц), 30 (пт)** — «Балада пра Белую Вішню»

**Музычны тэатр**

**22 (чц), 23 (пт), 27 (аўт)** — «Рускі фантом»
**24 (сб)** — «Бураціна.by»
**24 (сб)** — «Лятучая мыш»
**25 (ндз)** — «Прыгоды брэменскіх музыкаў»
**25 (ндз)** — «Вясёлая ўдава»
**28 (ср), 29 (чц)** — «Юнона і Авось»
**30 (пт)** — «Ноч у Венецыі»

**Тэатр-студыя кінаактора**

**22 (чц)** — «Востраў нашай любові і надзеі»
**23 (пт)** — «Тэатр купца Япішкіна»
**24 (сб)** — «...Забыць Герастрата!»
**25 (ндз)** — «Тацянін дзень»
**27 (аўт)** — «Стрэмка»

**Балет**

**24 (сб)** — «Вечар класічнай і сучаснай харэаграфіі»
**25 (ндз)** — «Жарсці (Рагнеда)»
**27 (аўт)** — «Баядэрка»

**Тэатр беларускай драматургіі**

**23 (пт)** — Юбілейны вечар Таццяны Мархель
**28 (ср)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**29 (чц)** — «Неба ў дыяментах»
**30 (пт)** — «Апошняя жанчына Сеньёра Хуана»

**Опера**

**22 (чц)** — «Алека»
**23 (пт)** — «Нататкі вар'ята»
**28 (ср)** — «Баль-маскарад»

**Тэатр юнага гледача**

**22 (чц)** — «Пацалунак ночы»
**29 (чц)** — «Рыцар Ордэна Сонца»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Стылягі

**Стылягі** (Стиляги)
Расія, 2008, каляровы, 120 хв.
**Рэжысёр:** Валер Тадароўскі
**Жанр:** Мюзікл
**Адзнака:** 7,5 (з 10)




Масква, сярэдзіна 1950-х. Камсамолец Мелс, які ладзіць аблавы на стылягаў, сам падпадае пад уплыў «варожай ідэалогіі», зачараваны прыгажуняй Палінай (Аксана Акіншына). І цяпер былы камсамолец носіць стракатыя гарнітуры і танчыць пад заходнюю музыку.

Маскву 1950-х здымалі ў Мінску. Праз асфальт сталінскай эстэтыкі прабіваюцца нястрымаxныя парасткі — зялёныя, бэзавыя, пунсова-вішнёвыя, каб разбурыць аднастайную шэрасць.

У фільме скарыстаныя песні 1980-х — і камсамольцы змрочна спяваюць пра «скутых адным ланцугом», камунальныя суседзі бадзёра танчаць з рондалямі, а герой па-майстэрску асвойвае саксафон.

Экран выбухае святам свабоды. І як колішнія стылягі былі першым знакам распаду сталёвага камунізму, так і стужка Тадароўскага абвяшчае канец пуцінскае эпохі.

**Андрэй Расінскі**

# «Белсат»: тэлепраграма на 26 студзеня—1 лютага
## «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 26 студзеня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Ранча», серыял, 10 серыя
**19.00** «Gloria victis», рэпартаж, 2008 г.
**19.25** Навагодні канцэрт «Снежны завулак, 9, альбо Такога няма нідзе»
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Хто ёсць кім? Вольга Завадская
*Вольга Завадская — маці зніклага без следу 7 ліпеня 2000 г. апэратара расійскай тэлекампаніі ОРТ Змітра Завадскага. Афіцыйна справа аб ягоным знікненні лічыцца скончанаю, і па ёй некалькі асобаў атрымалі доўгатэрміновае турэмнае зняволенне. Аднак маці не верыць у тое, што пакаралі сапраўдных злачынцаў, бо не атрымала адказу на галоўныя для яе пытанні: як загінуў і дзе пахаваны яе сын? Жанчына страціла была веру ў справядлівасць, аднак непахісная воля супрацьстаяць трагедыі зрабілася для яе стымулам перайсці ад чакання да дзеяння.*
**21.30** «Чалавек, якога там не было» (The Man Who Wasn't There), маст. фільм, рэж. Джоэл Коэн, 2001 г., ЗША. У ролях: Білі Боб Торнтан, Фрэнсіс МакДорманд, Скарлет Ёгансан
**23.30** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 9 серыя
**00.10** Аб'ектыў (навіны)

### 27 студзеня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 9 серыя
**18.55** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**19.25** «Права быць свабодным»: канцэрт альтэрнатыўнай музыкі, Луцк—2007. У першай частцы канцэрту выступаюць гурты: «Сцяна», :В:N: і «Тінь Сонця».
**19.55** Невядомая Беларусь: «Атамны полк», дак. фільм, 2008 г.
**20.30** Рэпарцёр (інфармацыйная праграма)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** «Невядомая Беларусь»: «НКВД — гестапа: шлюб па разліку», дак. фільм, 2008 г.




**21.50** Ток-шоу «Форум»: Як абараніцца ад крызісу?
**22.35** «Соня і яе сям'я», дак. фільм, рэж. Даніела Руснакава, 2006 г., Славакія
**23.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 10 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 28 студзеня, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 10 серыя
**18.55** Паштоўка з Вільні (праграма пра беларусаў Літвы)
**19.15** «Баравічок», дак. фільм, 2007 г., Беларусь




**20.10** Маю права (прававая праграма)
**20.25** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** YoLife! (моладзевая праграма)
**21.35** «Без рэтушы»: «Жывыя і мёртвыя», дак. фільм, 2008 г.
**22.10** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**22.25** Выступ гурту «Тав. Маўзер» на фестывалі Be Free (2008), ч. 1
**23.00** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 2 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы



**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 29 студзеня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 2 серыя
**19.00** Падземка (беларускі хітпарад)
**19.35** Хто ёсць кім?: Сяржук Вітушка
**19.50** «Нармальнае жыццё», дак. фільм, рэж. Чаі Вашархэі і Х'юга Бэрклі, 2003 г., ЗША
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Сальда (эканамічная праграма)
**21.35** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**22.05** Інтэрнаўты выбіраюць
**22.40** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 3 серыя
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 30 студзеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Зграя», дэтэктыўны серыял, 3 серыя
**19.00** Праект «Будучыня»: навукова-папулярны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»
**19.30** «Вароніна возера», дак. фільм, рэж. Інеса Куркліеціце, 2007 г., Літва
*Чацвёра падлеткаў, знуджаных штодзённасцю, знаходзяць сабе прытулак на былой савецкай вайсковай базе, якая месціцца побач з дзейнаю базаю NATO. Цяпер былы савецкі гарнізон — нічыйная тэрыторыя. Навокал — ваенныя таямніцы, пахаваныя пад руінамі бункераў і ангараў, а над імі з гулам праносяцца рэактыўныя лет-*




*такі. Хлопцы абвяшчаюць гэтую тэрыторыю «Зонаю свабоды» — месцам, дзе іх ніхто не зможа ні ў чым абмежаваць. У адным з закінутых ангараў яны будуюць лятальны апарат. Неўзабаве высвятляецца, што на «нічыйнай зямлі» шукае сховішча стары валацуга. Дзеці намагаюцца выгнаць яго з сваёй «Зоны». Нарастае канфлікт, у якім выяўляюцца характары герояў, паказваюцца сапраўдныя аблічча.*
**20.40** Беларусы ў Польшчы
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Госць «Белсату»: перадача пра надзённыя праблемы Беларусі
**21.35** «Дырыжор», маст. фільм, рэж. Анджэй Вайда, 1979 г., Польшча.
*Марта, маладая і таленавітая скрыпачка, прыязджае на навучанне ў ЗША, дзе сустракае выдатнага дырыжора польскага паходжання Джона Ласоцкага. Аказалася, што ў яго калісьці была закаханая маці Марты. Маладзіца вяртаецца ў Польшчу, жыве ў невялікім горадзе, адкуль паходзіць Ласоцкі. Муж Марты, Адам, не можа зразумець, што адбываецца з жонкаю пасля навучання ў Амерыцы...*
**23.15** «Пітбуль», серыял, 11 серыя
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 31 студзеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.45** «Обчына» (Obcina), дак. фільм, рэж. Б'ёрн Райнгарт (Bjorn Reinhardt), 2007 г., Германія
**19.45** Бульбаны
**20.00** На колах: аўтамабільны агляд тэлеканалу «Нямецкая хваля»




**20.25** Кружэлка (сусветная музыка)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Віртуальная помпа (агляд Сеціва)
**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.05** «Развод па-амерыканску», камедыя, рэж. Рэджыналд Гадлін, 2002 г., ЗША.
*У судовага кур'ера Джо Тайлера нялёгкая праца: ён дастаўляе позвы ў суд. Вядома, далёка не кожны прагне сустрэцца з прадстаўнікамі закону, таму Джо часам вымушаны адсочваць месца знаходжання сваіх «ахвяраў». Ягоны бос Рэй дае Джо чарговае заданне: даставіць позву з дакументамі на развод нейкай Сары Мур, муж якой, паводле заканадаўства Тэхасу, пасля разводу атрымае ўсю маёмасць. Нягледзячы на перашкоды, Джо ўдаецца сустрэцца з Сараю. Тая даведваецца, што, калі разводны працэс будзе перанесены ў Нью-Йорк, яна, ужо паводле мясцовых законаў, зможа пакінуць за сабою палову супольнае маёмасці. Сара прапануе Джо за мільён даляраў перайграць сітуацыю...*
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (гумарыстычная праграма)
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

### 1 лютага, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс (агляд друку)
**18.15** «Ранча», серыял, 11 серыя
**18.50** Выступ гурту «Крама» на фестывалі Be Free 2008 г., ч. 5
**19.40** Жаўтуха
20.05 «Дарога праз стэпы між аазісаў» (Step Road Oasis), дак. фільм, 2007 г., Японія
*Фільм быў створаны падчас падарожжа па краінах былога Савецкага Саюзу. Найбольш аўтараў цікавяць падзеі ў Кіргізстане і Узбекістане. З аднаго боку, гэтыя краіны перажываюць цяжкія часы, з іншага — маюць вялікі шанец на развіццё.*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Ток-шоу «Форум»: Ці варта выходзіць на вуліцу?




**22.10** «На злом галавы», маст. фільм, рэж. Фатых Акын, 2004 г., Германія—Турцыя.
*Яны пазнаёміліся ў вар'ятні, у адзяленні для суіцыдных, але ніхто з іх не думаў па-сапраўднаму сконьчыць жыццё самагубствам. Кахіт, немец турэцкага паходжання, пасля смерці жонкі ўвогуле нічога не хацеў і проста ўехаў на сваім аўтамабілі ў мур, а Зыбэль пэрэзала сабе вены, каб дапячы сваёй вялізнай мусульманскай сям'і ды на нейкі час пазбавіцца ад іх надакучлівай апекі, слухаць панк, танчыць да раніцы і кахацца з кім прыйдзецца. На шпацыры ў дворыку лякарні Зыбэль прапанавала Кахіту стаць жонкаю. Яны фіктыўна пабраліся шлюбам. Зыбэль стала цешыцца сваім свабодным жыццём, а Кахіт па-ранейшаму спіць са сваёй дзяўчынаю. Але паступова Кахіт і Зыбэль пачынаюць разумець, што яны кахаюць адно аднаго...*
**00.10** Аб'ектыў (вынікі тыдня)



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Брыгада спецназу 3214 адзначыла Вадохрышча купаннем у возеры ля вёскі Задамля. Першым перахрысціўся і нырнуў Дзмітры Паўлічэнка. Хоць ён фармальна больш у брыгадзе не служыць. І нягледзячы на чуткі пра свае хваробы.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Ст.Гудагай, Віленскай губ.** — 17 студзеня а 5 гадзіне зрання — яшчэ было цёмна — жонку арандатара фальварку сяржанты разбудзіў страшэнны гром. Зазвінелі шклы ў вокнах і здалося гаспадыні, што падае дом. Але ўсё ўціхла; хутка прыбег арандатар, што быў пры скаціне ў хлеве, і расказаў, што і ён таксама чуў гул, быццам гром праляцеў па небе, зямля задрыжала, і жывёлы пападалі на калені. Выбегшы з хлева, ён убачыў недалечка быццам роў, глыбокі, каторы цягнуўся мусіць з вярстку ўздоўж з поўначы на поўдзень.

Думаюць, што гэта водгалас страшэннага трасення зямлі, што зруйнавала ў Італіі некалькі вялікіх гарадоў і без ліку вёсак.

**«Наша Ніва». №3. 1909**

**Ад Рэд.** Станцыя Гудагай — гэта пад Астраўцом, дзе надумаліся будаваць АЭС. Землятрус, адчуты пад Гудагаем, — адзін з наймацнейшых у гісторыі Беларусі.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

Маладафронтаўцы з вялікай радасцю віншуюць свайго дарагога сябра **Змітра Дашкевіча** з гадавінаю выхаду на свабоду і доўгачаканым вяртаннем да нас! Волі і пераменаў! З любоўю, сябры

### ГРОШЫ

**Усіх**, каму вінен грошы Павел Жук, просім перадаць звесткі на адрас zhukizhaba@tut.by (незалежна ад сумы і даўнасці)

### ПІЯНІНА

**Падарую добраму беларусу** піяніна «Беларусь» чорнага колеру, 2–педальнае. Т.: 204–58–45

### ПАДСЯЛЕННЕ

**Вазьму на падсяленне** прыстойнага чалавека. Двухпакаёўка. Блізка метро «Парк Чалюскінцаў». Нядорага! Т.: (029) 305 20 91. Сяргей

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ЖАРТЫ

* * *

Смяротнае пакаранне адмяняюць. Яго замяняюць на валютны крэдыт пад 25% гадавых.

* * *

Ляціць крызіс над ЗША:

— О! Бачу, я тут добра папрацаваў!

Ляціць крызіс над Еўропай:

— А! Гляджу, і тут я выдатна пастараўся!

Ляціць крызіс над Беларуссю:

— Уй-юй-юй! І хто гэта тут без мяне такога нарабіў?!

* * *

— Чаму нафта патаннела ўдвая, а бензін — не?

— Бо ў Беларусі бензін робяць не з нафты. 

* * *

— Такога вірусу ў мяне яшчэ не было! — сказаў заяц, пабачыўшы за кампутарам цешчу.

## І ТАКОЕ БЫВАЕ

### Цуд на Гудзоне

Аэробус А-320 рабіў рэйс з нью-йоркскага аэрапорту Ла Гуардыя ў Шарлот (штат Паўночная Караліна). Праз хвіліну пасля вылету ў рухавік трапіла чарада гусей. Лайнер здзейсніў пасадку на ваду, практычна пасярод хмарачосаў Манхэтэна, але ніхто не загінуў.

Пілот аэробуса, што паспяхова прывадніўся на Гудзон — Чэслі Саленбергер. Трэці выпускнік Акадэміі ВПС ЗША з саракагадовым стажам. Улады Нью-Йорку ўжо назвалі яго героем.

**Паводле Бі-Бі-Сі**



**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5600. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 20.01.2009.
Замова № 320.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

9 771819 161008 09003